ШТОТЫДНЁВАЯ ГАЗЕТА ДЛЯ СУАЙЧЫННІКАЎ
ЗА МЕЖАМІ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Голас Радзімы

№ 26 (2324) 1 ліпеня 1993 г. Выдаецца з 1955 г.

ДА ПЕРШАГА З'ЕЗДА БЕЛАРУСАЎ СВЕТУ ЗАСТАЎСЯ ТОЛЬКІ ТЫДЗЕНЬ

ПАД КРЫЖАМ ЕФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ



Падрыхтоўка да Першага з'езда беларусаў свету завяршаецца. Ужо можна пазнаёміцца з праграмай, ці, інакш кажучы, з рэгламентам мерапрыемстваў, што адбудуцца ў Беларусі з 3 па 10 ліпеня. Нарэшце самалёты і паязды штодня дастаўляюць у сталіцу з розных кантынентаў, з далёкага і блізкага замежжа дэлегатаў, якія прымуць удзел у афіцыйных і неафіцыйных падзеях, сустрэнуцца са сваякамі і знаёмымі, многія ўпершыню за паўстагоддзя апынуцца ў абдымках Бацькаўшчыны. Асноўныя выдаткі — на сустрэчы, уладкаванне ў гатэлях і харчаванне дэлегатаў — узяло на сябе Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына". 60 мільёнаў на правядзенне форуму выдаткавала дзяржава, 20 мільёнаў прыслаў беларус з сібірскага горада Сургута, прадпрымальнік Анатоль Сілівончык.

Задоўга да з'езда арганізацыйны камітэт па яго правядзенню аб'явіў конкурс на эмблему, што адпавядала б ідэі гэтага мерапрыемства. У конкурсе перамог мастак Эдуард Агуновіч. Эмблемай з'езда стала выява беларускай асветніцы Ефрасінні Полацкай, вобраз якой з'яўляецца сімвалам еднасці нашага народа, яго духоўнасці і адраджэння. Крыж у руках Прадславы — адзін з асноўных элементаў эмблемы і мае глыбокі сімвалічны сэнс, увасабляючы ў сабе каштоўнасці хрысціянства, да таго ж рэальны крыж Ефрасінні Полацкай, унікальная рэліквія беларускага народа, быў страчаны ў гады апошняй вайны і да гэтага часу не адшуканы.

Эмблема з выявай асветніцы будзе на значках, прысвечаных з'езду, на канвертах, паштоўках і марках, на харугвах і сувенірах, выкананых да знамянальнай падзеі. У нацыянальным беларускім духу будзе аформлена сцэна і зала Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, дзе 8-10 ліпеня мае адбыцца з'езд беларусаў свету.

З'езд задумваўся і рыхтаваўся ва ўзаемадзеянні згуртавання "Бацькаўшчына" і дзяржаўных афіцыйных структур, але, як падкрэсліла кіраўнік р... бочай групы ад згуртава... "Бацькаўшчына" па падрыхтоўцы з'езда Ганна Сурмач, "інтэлектуальнае напаўненне з'езда забяспечвалі поўнасцю мы". На пытанне, што маецца на ўвазе, яна адказала, што менавіта "Бацькаўшчына" найлепш ведае якасны склад беларускіх суполак у свеце і, зыходзячы з гэтага, рассылаліся запрашэнні. Запрошаны гісторыкі, літаратары, прадстаўнікі інтэлігенцыі і проста беларусы, якія не страцілі духоўную повязь з Радзімай. Імкнуліся, каб сярод запрошаных былі прадстаўнікі розных канфесій і людзі, якія здольны дапамагчы станаўленню нашай суверэннасці, дзяржаўнасці, у стане паспрыяць выхаду краіны з цяжкага крызіснага стану.

Задзейнічаны ў падрыхтоўцы да з'езда вялікія інтэлектуальныя сілы. Так, у рэдакцыйную камісію, якая працавала над галоўным дакладам "Беларуская ідэя і адбудова беларускай дзяржаўнасці", што будзе прачытаны віцэ-прэзідэнтам АН Беларусі Радзімам Гарэцкім, увайшлі відныя беларускія вучоныя У.Конан, І.Саверчанка, В.Чамярыцкі, В.Скалабан, А.Сабалеўскі і іншыя.

Найбольшая інтэлектуальная работа мяркуецца пры правядзенні "круглых сталоў", сустрэч па інтарэсах, што адбудуцца ў арганізацыях і ўстановах. Тэмы іх: "Беларуская дзяржаўнасць", "Беларуская гаспадарка, прадпрымальніцтва", "Беларуская культура", "Беларуская дыяспара". Адбудзецца "круглы стол" і па чарнобыльскіх праблемах з удзелам найбольш зацікаўленых асобаў з ліку прыезджых.

(Заканчэнне на 6-й стар.).

САЮЗ БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ: ПАСТАВІМСЯ СПАКОЙНА І РАЗВАЖЛІВА — ГЭТА ЎЖО ФАКТ МІНУЎШЧЫНЫ

У Мінску адзначаюць 50-годдзе з дня заснавання Саюза беларускай моладзі... "Ашалець можна! Во дажылі!" — абураецца адна палавіна (ці нейкая частка) нашага грамадства, і няма мяжы таму абурэнню. "Дажылі нарэшце, дачакаліся свайго дня!" З сатысфакцыяй, можа, з прымессю зларадства цешыцца тая другая палавіна (ці частка), якая цяпер можа смела адзначаць угодкі СБМ. Такое ўжо наша грамадства сёння, падзеленае на камуністаў і дэмакратаў, былых партызан і былых паліцаяў, СБМ-аўцаў і камсамольцаў, "нацыянальна свядомых беларусаў" і "інтэрнацыяналістаў". І так ужо мы ўспрымаем, з двух пунктаў гледжання, прынамсі, і падзеі сённяшняга дня, і тое, што сталася гісторыяй.

Ведаем, што і матэрыялы, прысвечаныя Саюзу беларускай моладзі (чытайце на стар. 4—5), будуць прачытаны, успрыняты і ацэнены неаднолькава рознымі людзьмі і ў далёкім ды блізкім замежжы, і тым болей тут, на Беларусі. Але давайце захаваем спакой і раўнавагу.

Мы не маем намеру вяртацца да старога, калі на ўсё тое, што рабілася ў вайну не пад савецкім, не пад партызанскім флагам, лёгка было чапляць ярлыкі: "антысавецкі", "здрадніцкі", "антынародны". Нам хацелася б адкінуць як савецкі прынцып "гераізацыі мінулага", так і дэмакратычную эйфарыю вакол дат і падзей, асвячоных неўміручасцю беларускай ідэі.

Гісторыя патрабуе апанаванай развагі і мудрасці. Саюз беларускай моладзі ўжо стаўся фактам гісторыі. Давайце ж спакойна паглядзім на гэты факт з дыстанцыі 50 год і пастараемся зразумець людзей таго часу і таго пакалення. Яны тварылі гісторыю, якая належыць усім нам. Нашу гісторыю, не савецкую, а беларускую. Нам трэба пільна аналізаваць яе, імкнуцца зразумець, зыходзячы з крытэрыяў аб'ектыўнасці, праўды. А ацэнку зробіць час.

НЕШТА СПЕЕ Ў НАРОДЗЕ



Чэрвень 1993 года нагадаў нам пра красавік 91-га: зноў закіпелі мітынгі на плошчах Мінска. Самы шматлюдны адбыўся 11-га чэрвеня на праспекце Машэрава ля Палаца спорту. Арганізаваў яго Савет прафсаюзаў Беларусі, а вывела на вуліцы людзей страшэннае падзенне жыццёвага ўзроўню, асабліва — апошні скачок цэн. І хоць наш урад упэўнены, што ён робіць усё найлепшым чынам і сацыяльнае становішча ў Беларусі, бадай, найлепшае з усіх рэспублік СНД, на мітынгу было сказана нямала моцных слоў у яго адрас. Асноўная скіраванасць шматтысячнага мітынгу — пратэст супраць урадавай палітыкі павышэння цэн, пагаршэння жыцця розных слаёў народа.

Фота А. ТАЛОЧКІ.

ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ ФАКТЫ

СЕЛЕКТАРНАЯ НАРАДА

СКЛАДАНАЯ СІТУАЦЫЯ

Не ад'язджаючы з абласцей і раёнаў, абмеркавалі з прадстаўнікамі заканадаўчай улады і Мінсельгаспрада праблемы, што хвалююць вяскоўцаў, старшыні абл- і райвыканкомаў, начальнікі абласных і раённых служ-баў аграпрамысловага комплексу на селектарнай нарадзе, якую вёў намеснік Старшыні Савета Міністраў Аляксандр Бокач.

Асобую трывогу спецыялістаў выклікае становішча з пацярпеўшымі ад замаразкаў і засухі пасевамі. Практычна ва ўсіх абласцях прыйдзецца перасяваць вялікія плошчы, асабліва на Віцебшчыне і Магілёўшчыне.

Менавіта з гэтага — недабору будучага ўраджаю — і пачыналі свае справаздачы прадстаўнікі абласцей.

Як катастрафічную ацаніў міністр сельскай гаспадаркі Фёдар Міравчыцкі сітуацыю ў жывёлагадоўчай галіне. За пяць месяцаў бягучага года ў рэспубліцы на 18 працэнтаў скараціліся пастаўкі малочнай і на 14 — мясной прадукцыі ў параўнанні з такім жа перыядам мінулага года. Пагалоўе жывёлы ў Беларусі зменшылася на 240 тысяч, што на справе азначае страту жывёлагадоўлі цэлай вобласці. Зніжэнне тэмпаў вытворчасці працягваецца і сёння. І толькі дзвюм абласцям удалося спыніць гэты працэс — Брэсцкай і Віцебскай.

І калі міністр у агульных рысах абмаляваў беды аграпрамысловага комплексу рэспублікі, то кіраўнікі абласных службаў гаварылі аб іх на ўвесь голас: аб вострым дэфіцыце грашовай масы, мінеральных угнаенняў, паруча-змазачных матэрыялаў, насення. Калі ў бліжэйшы час усё гэта не паступіць у дастатку, няма чаго гаварыць пра перасеў загубленых плошчаў, пасняховай уборцы кармоў і ўраджаю, а значыць, стабілізацыі спраў у жывёлагадоўлі. На нарадзе былі абмеркаваны і іншыя складаныя пытанні.

КАНВЕРСІЯ

НАПАЛАМ І АТАМ, І ПРАБЛЕМЫ

Амерыканцы з разуменнем ставяцца да нашых канверсійных праблем. Такі вывад зрабілі спецыялісты Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь пас[illegible] таго, як сумесна з экспертамі з-за акіяна закончылі [illegible]едчыя работы па рэкультывацыі (абеззаражван[illegible] ваенных аб''ектаў, на якіх захоўваліся кампаненты для ядзерных ракет стратэгічнага прызначэння.

Адзін з такіх аб''ектаў амерыканскія спецыялісты наведалі ў горадзе Смаргоні.

Галоўная мэта візіту — сабраць даныя, якія дапамогуць распрацаваць пакет мерапрыемстваў [illegible] аднаўленню экалагічна чыстага асяроддзя на ме[illegible] захоўвання ядзернай зброі.

Па выніках работ прадстаўнікі міністэрстваў абароны дзвюх дзяржаў падпішуць пагадненне аб супрацоўніцтве пры дэмантажы аб''ектаў. Амерыканскі бок прыняў абавязацельства дапамагчы нам спецыяльнай тэхнікай: апаратурай дыстанцыйнага зандзіравання, тэлеметрычнымі прыборамі, палявымі лабараторнымі ўстаноўкамі.

ДЛЯ АХОВЫ ГРАНІЦ

З 8 ДА 12,5 ТЫСЯЧЫ

Беларускі парламент прыняў рашэнне павялічыць колькасць пагранічных войск з 8 да 12,5 тысячы чалавек.

Як паведаміў калегам народны дэпутат і камандуючы пагранвойскамі Беларусі Яўген Бачароў, на мяжы з Польшчай цяпер служаць 4 тысячы чалавек, і на 1 кіламетр мяжы прыпадае каля 8 чалавек, хаця пры СССР нормай было 15—18 чалавек на кіламетр. Па словах Бачарова, на прыбалтыйскім і ўкраінскім напрамках плануецца шчыльнасць 3—4 пагранічнікі на кіламетр.

Парламент выдзеліў на павелічэнне пагранвойска на працягу 2 гадоў 10 мільярдаў рублёў. "Мне прапаноўвалі такі варыянт: узяць некалькі палкоў ці адну-дзве дывізіі і паставіць іх на дзяржаўную мяжу", — расказаў Бачароў. Але, па яго перакананню, пагранвойскі трэба ствараць планамерна, а не з армейскіх часцей.

Што тычыцца мяжы з Расіяй, то яна пакуль ахоўвацца пагранічнікамі Беларусі не будзе. "Асабіста мне як камандуючаму непрыемна думаць, што будзе, калі на ўсходзе мы будзем усталёўваць гэтую мяжу. Колькасць войск тады ўжо будзе мінімум 22—24 тысячы".

СЛУЖБОВАЕ САБАКАВОДСТВА



Ірына БУЛЧЫНСКАЯ (на здымку) — інжынер-тэхнолаг. Але ў апошні час у яе лёсе намеціўся рэзкі крэн. Цяпер яна загадвае гадавальнікам службовага сабакаводства, які створаны пры Іванаўскім райспажывсаюзе. Тут разводзяць пародзістых сабак, якія заменяць на аб'ектах старых вартаўнікоў.

Жывёл Ірына любіць з дзяцінства. Мяркуючы па тым, якія паслухмяныя яе падапечныя, як дакладна выконваюць яе каманды, Ірына — на сваім месцы.

ПРАФЕСІЙНАЯ АДУКАЦЫЯ

Мінскі авіятэхнічны каледж — адна з нямногіх навучальных устаноў рэспублікі, якая ўстаяла перад націскам беспрацоўя. Яго ратуе тое, што спецыяльнасці, якія прапаноўваюцца тут, можна выкарыстоўваць не толькі ў грамадзянскай авіяцыі, але і ў многіх галінах народнай гаспадаркі.

Новым у навучанні курсантаў стала апошнім часам тое, што ў каледжы больш увагі цяпер надаюць замежным мовам, бо Беларусь асвойвае міжнародныя авіялініі. З гэтага года тут рыхтуюць тэхнікаў-механікаў па эксплуатацыі паветраных суднаў і авіярухавікоў.



НА ЗДЫМКУ: першакурснікі Павел САРОКІН (злева) і Дзмітрый БЕКЕРА на практычных занятках у самалёце ТУ-154 Б.

МІНСКІ МЕТРАПАЛІТЭН

ЯШЧЭ АДНА СТАНЦЫЯ

Складаная эканамічная сітуацыя, у якой апынулася рэспубліка, адбіваецца, вядома, на тэмпах будаўніцтва метро ў беларускай сталіцы. Але ўсё-такі яно будуецца.

Нядаўна пачалася забіўка буранабіўных [illegible] ў за тупікамі станцыі "Пушкінская". Неўзабаве [illegible] пачнецца будаўніцтва катлавана для будучай станцыі "Жудро". Гэты ўчастак работы даручаны метрабудаўнікам, якія ўзводзяць станцыю ў раёне вуліцы Апанскага. Будучая лінія звяжа густанаселены раён Кунцаўшчыны з цэнтрам Мінска і аўтазаводскім раёнам беларускай сталіцы.

АДУКАЦЫЯ

"ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ"

Упершыню ў гісторыі нашай дзяржавы вядучымі вучонымі і педагогамі-практыкамі рэспублікі створаны школьны падручнік, які расказвае аб станаўленні і развіцці Беларусі. Яго прэзентацыя адбылася 25 чэрвеня ў Міністэрстве інфармацыі.

Падручнік, які атрымаў назву "Гісторыя Беларусі", прызначаны для вучняў 5—6-х класаў. Аднак, як паведамілі ў Міністэрстве адукацыі, згодна з планам да пачатку новага навучальнага года на партах беларускіх школьнікаў з'явяцца яшчэ 20 новых па змесце падручнікаў. Усе яны будуць расказваць аб гісторыі і геаграфіі рэспублікі.

ГУМАНІТАРНАЯ ДАПАМОГА

"УЗБРОЙВАЕМСЯ" ВАКЦЫНАМІ

Дзіцячы фонд ААН і Еўрапейскае рэгіянальнае бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя пачалі чарговую гуманітарную акцыю — пастаўку ў Беларусь вакцын для правядзення прывівак дзецям.

Першыя 100 тысяч доз бельгійскай вакцыны супраць поліяміэліту і 150 тысяч доз англійскай вакцыны супраць адру ўжо прыбылі ў рэспубліку. Чакаецца паступленне вакцыны супраць дыфтэрыту, коклюшу, слупняку. З замежжа таксама плануюць прыслаць у Беларусь абсталяванне для захоўвання даных прэпаратаў — сумкі-халадзільнікі, тэрмакантэйнеры, тэрмаіндыкатары, маразільнікі і іншае.

ТЭРАРЫЗУЮЦЬ

ЯРАСЛАЎ ЕЎДАКІМАЎ ШУКАЕ ПРЫТУЛКУ

Вядомы беларускі спявак Яраслаў Еўдакімаў апошнім часам сур'ёзна раздумвае пра пераезд на пастаяннае жыхарства з Мінска ў Маскву.

Магчымая прычына эміграцыі — званкі па тэлефоне, што тэрарызуюць яго: то паклоннікі, то цёмныя асобы пагражаюць. Спеваку даводзіцца мяняць свой нумар кожны месяц. Мяркуюць, што прычына тэлефоннай блакады — разрыў адносін з кампазітарам Ігарам Лучанком, якога Еўдакімаў лічыць устарэлым. У сваю чаргу Лучанок пагражае адабраць у Яраслава кватэру ў элітным урадавым доме, якую нібыта дапамагаў атрымліваць.

Аднак Еўдакімаў апасаецца, што ў Маскве будзе менш папулярным, чым у Мінску. І ўсё ж дачу ў Перадзелкіне спявак сабе ўжо прыгледзеў, а памяняць шыкоўную кватэру на маскоўскую — не праблема.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

ЗА ПЯЦЬ месяцаў сёлетняга года ў Мінску выяўлена 60 фальшывых грашовых купюр ЗША, 12 — ФРГ, 8 разліковых білетаў Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь і 3 грашовыя купюры Расіі.

МІНІ-ГЭС пачне працаваць на рацэ Нішча ў Расонскім раёне. За год тут будзе атрымана 2,5 мільёна кілават-гадзін электраэнергіі. Віцебская вобласць атрымае эканомію ў 1 000 тон паліва.

ВЯДОМАЯ фірма ЗША "Трыпіні Світс" і гомельская фабрыка "Спартак" вырашылі ствараць сумеснае прадпрыемства. Супрацоўніцтва пачалося з выпуску шакаладу. Гэта дапамагло фабрыцы і захаваць рабочыя месцы, і расшырыць вытворчасць, і атрымаць дадатковы прыбытак.

ПАСЛЯ некалькіх дзесяцігоддзяў забыцця адрадзіўся касцёл Святой Барвары ў Віцебску.

У яго асвячэнні прынялі ўдзел арцыбіскуп Беларускі К.Свёнтак і настаяцель касцёла ксёндз Януш.

НА РОДНАЙ мове будуць выкладацца ўсе прадметы ў Мінскім тэхнікуме гандлю з першага верасня. Такое рашэнне прыняў выкладчыцкі калектыў гэтай буйной у Беларусі навучальнай установы. Тут ужо падрыхтавана 18 тысяч спецыялістаў.

У ОРШЫ не рызыкуюць адкрываць купальны сезон. Справа ў тым, што ў Дняпры выяўлена страўнікавая палачка, якая ў пяць разоў перавышае дапушчальныя нормы. Не абсталяваны таксама гарадскія пляжы кабінамі для пераапранання, няма тапчаноў, ценявых навесаў.

ВЯРТАННЕ

ЖЫЦЦЯПІС БАРЫСА УЛАДЗІМІРАВІЧА КІТА



Лідзія САВІК

Ды і, шчыра кажучы, яго асабліва туды і не ўцягвалі. Ён наогул ніколі не належаў ні да якіх палітычных партый, аддаючы ўвесь свой час, сваю нястомную энергію і талент толькі педагагічнай і навуковай дзейнасці. Барыс Кіт заставаўся незалежным і ў час вайны, не ўваходзіў ні ў якую нямецкую калабарацыю, працаваў толькі дзеля беларускага школьніцтва, што ніякім чынам не можа лічыцца супрацоўніцтвам з немцамі. Што б ні здарылася, якія б войны ні абрынуліся і колькі б ні працягваліся, дзяцей заўсёды трэба вучыць, бо яны — будучыня народа. Гэту ісціну добра ўсведамляў беларускі настаўнік-патрыёт.

Забягаючы наперад, трэба адзначыць, што ў 1948 годзе, калі Барыс Кіт эмігрыраваў у Амерыку і заснаваўся ў Саўт-Рыверы (штат Нью-Джэрсі), ён шмат дапамагаў беларусам-эмігрантам у пераездзе, не зважаючы на іх палітычныя перакананні — зарубежнікі яны (БЦР) ці крывічы (БНР). Дзякуючы яму, і была створана беларуская калонія ў гэтым амерыканскім мястэчку. Яго хуткі затым пераезд у Каліфорнію, дзе ён распачаў сваю навуковую астранаўтычную кар"еру, часткова быў вынікам асабістага расчаравання з прычыны канфліктаў, якія пачаліся паміж гэтымі дзвюма групоўкамі, калі большасць беларусаў-эмігрантаў прыехала ў ЗША.

Але вернемся да часоў яго працы ў Навагрудскай гімназіі (1939—1940). Арганізатарскія здольнасці Барыса Кіта, яго ўменне працаваць з людзьмі былі заўважаны і высока ацэнены школьнымі ўладамі. Ён быў назначаны акруговым інспектарам Баранавіцкай акругі, і, такім чынам, пад яго кантроль увайшлі ўсе школы Баранавіцкага, Навагрудскага, Слонімскага, Валожынскага, Ваўкавыскага паветаў. Шырока разгарнулася дзейнасць Барыса Кіта па развіццю беларускага школьніцтва. На працягу года ён адкрыў каля сотні пачатковых і дзесяткі сярэдніх школ. А гэта была не такая простая і лёгкая справа ў той складаны, трывожны час, калі адчувалася пагроза блізкай вайны. Неабходна было ў кожнай вёсцы, мястэчку знайсці адпаведныя памяшканні, настаўнікаў, стварыць ім прыстойныя ўмовы, дабіцца хоць нейкіх матэрыяльных пераваг, каб яны маглі ехаць у вясковыя школы і плённа працаваць. Нялёгка было здабыць мэблю, падручнікі, кнігі, сшыткі. Ён уваходзіў з хадайніцтвамі ў самыя розныя арганізацыі, патрабаваў, прасіў, імкнучыся знайсці агульную мову з кожным чыноўнікам, ад якога залежала станоўчае вырашэнне таго або іншага пытання. Бясконцыя раз"езды, наведванні школ, інспектарскія праверкі, заўсёды добразычлівае жаданне дапамагчы, падказаць, навучыць нявопытнага настаўніка — на ўсё хапала энергіі, настойлівасці і цярпення Барыса Кіта. І ён бачыў аддачу. Школы працавалі, вучылі дзяцей, а гэта галоўнае, дзеля чаго ён жыў, чым натхняўся.

Адначасова з гэтай дзейнасцю Барыс Кіт працаваў яшчэ і выкладчыкам матэматыкі ў Баранавіцкім настаўніцкім інстытуце. Тут ён пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай Нінай Корсак, бацькі якой жылі ў мястэчку Лебедзева каля Маладзечна. У Лебедзеве нарадзіўся ў 1941 годзе іх першы сын Уладзімір. Але гэтая знамянальная падзея ў асабістым жыцці Барыса Кіта супала з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны.

Нямецкая акупацыя прынесла шмат гора беларускаму народу. Пачаў усталёўвацца "новы парадак", дзе расстрэлы мірных жыхароў сталі звычайнай з"явай. Немцы вынішчалі асабліва тых, хто займаў хоць нейкую пасаду пры савецкай уладзе ці быў камуністам. Барыс Кіт, хаця і не быў камуністам, але пасаду займаў немалую, быў вядомым чалавекам у акрузе. Даведаўшыся, што быў расстраляны інспектар вячэрніх школаў Генрых Дэмбінскі, у мінулым вядомы польскі дэмакратычны дзеяч, ён зразумеў, што яму неабходна ратавацца самому і выратоўваць жыццё сям"і. Пехатою накіраваліся яны да Лебедзева, дзе напачатку знайшлі прытулак у бацькоў жонкі. Перачакаўшы нейкі час небяспеку, Барыс Кіт пачынае працаваць у мясцовай школе, выкладае матэматыку і нямецкую мову. Але ён не пакідаў сваёй задумы адносна адкрыцця новых навучальных установ. Маючы звесткі, што немцы дазволілі адкрываць пачатковыя і вузкапрафесійныя школы, Барыс Кіт вырашыў дзейнічаць. Сустрэўшыся аднойчы са сваім калегам, школьным інспектарам Ма[illegible]чанскага раёна Яворскім, яны, па[illegible]шыся, пастанавілі паспрабаваць адчыніць настаўніцкую семінарыю ў Маладзечне. Дзеля гэтага трэба было атрымаць дазвол нямецкіх акупацыйных уладаў. У выніку вялікіх старанняў яны такі дазвол дасталі ў 1942 годзе, пабываўшы ў Мінску. У мясцовай маладзечанскай др[illegible]рні былі надрукаваны і распаўсюдж[illegible]абвесткі пра адкрыццё настаўніцка[illegible]семінарыі. Падалі заявы каля 300 маладых людзей, якія паспяхова здалі ўступныя экзамены, і пачалася навука. З памяшканнем асаблівых клопатаў не было (заняткі праводзіліся ў былым будынку педвучылішча), як і з настаўніцкім персаналам. Аднак не доўгай была радасць заснавальніка і дырэктара семінарыі Барыса Кіта. Нямецкі камісар Вілейскай акругі, даведаўшыся пра яе існаванне, прыехаў у Маладзечна, зачыніў не толькі настаўніцкую семінарыю, але і друкарню, дзе друкаваліся абвесткі. Быў дадзены загад арыштаваць дырэктара. Справа ў тым, што маладзечанская семінарыя была адкрыта без дазволу мясцовых улад, якія лічылі, што адной семінарыі, якая працавала ў Вілейцы, зусім дастаткова для акругі, тым больш для унтэрмэншаў, людзей другога гатунку, ніжэйшай расы, якімі яны лічылі беларусаў.

Дырэктару ўдалося пазбегнуць арышту. Ён выехаў у Мінск і, не пабаяўшыся рызыкі, пайшоў да кіраўніка школьнага аддзела Генеральнага камісарыята Беларусі з просьбай аб дапамозе. Лепшае, што той мог зрабіць для Барыса Кіта, — гэта пасланць яго дырэктарам семінарыі ў Паставы Глыбоцкай акругі.

Справа з Маладзечанскай семінарыяй крыху аціхла, небяспека быццам мінавала. Пазней у Маладзечне праз неймаверныя цяжкасці Барыс Кіт дабіўся, што была адкрыта гандлёвая школа, дырэктарам якой ён стаў. Перадаўшы дырэктарства ў Паставах свайму намесніку, развітаўшыся з вучнямі і настаўнікамі, з якімі ў яго склаліся вельмі добрыя адносіны, ён выехаў у Маладзечна. Аднак па дарозе быў арыштаваны нямецкім гестапа, як западозраны ў сувязях з партызанамі і ва ўсялякай іншай антынямецкай дзейнасці. 30 дзён яго трымалі ў Глыбоцкай турме і два тыдні ў Вілейцы. У чаканні вырашэння свайго лёсу ён перажыў усе жахі нямецкіх допытаў і расстрэлаў, бо кожны дзень з камеры, дзе ён сядзеў, большасць вязняў выводзілі на расстрэл, і кожны раз, калі адчыняліся дзверы, яму здавалася, што прыйшлі па яго. Дапамог яму вы[illegible]вацца яго былы вучань з Віленскай [illegible]арускай гімназіі Кастусь Касяк, які лічыўся беларускім упаўнаважаным у Вілейцы. На жаль, пазней немцы расстралялі Касяка за падпольную дзейнасць.

Вярнуўшыся ў Маладзечна, Барыс Кіт пачаў рабіць усе магчымыя і н[illegible]чымыя захады, каб ператварыць [illegible]длёвую школу ў адміністрацыйна-гандлёвы інстытут. Выкладчыкамі ў інстытут былі запрошаны многія выдатныя прафесіяналы, якія добра ведалі свае прадметы. На першы курс інстытута паступіла больш за 300 студэнтаў. Яны паходзілі пераважна з Маладзечанскага і Радашковіцкага раёнаў. Апрача агульнаадукацыйных навук, былі і спецыяльныя: гандаль, таваразнаўства, бухгалтэрыя, гандлёвае права, асновы адміністрацыі і інш. Наплыў абітурыентаў на 1943/44 навучальны год быў такі вялікі, што даявлося рабіць конкурсныя ўступныя экзамены. Вучэбны працэс быў добра і грунтоўна наладжаны, ішоў поўным ходам. Часта даводзілася дырэктару ратаваць сваіх студэнтаў ад нямецкіх акопаў, залічваць у свой інстытут звыш усялякай нормы юнакоў і дзяўчат, якім пагражаў прымусовы ўгон у Германію. Многім ён такім чынам выратаваў жыццё.

Тое, што Барыс Кіт замест ніжэйшай гандлёвай школы навучае студэнтаў па інстытуцкай праграме, дайшло да нямецкіх школьных уладаў. Ён зноў апынуўся на мяжы арышту. Было загадана неадкладна зачыніць інстытут. Пра гэты загад дырэктар не паведаміў студэнтам і не спяшаўся яго выконваць. Студэнты прайшлі поўны інстытуцкі курс навучання. Атрымліваючы дыпломы і віншаванні дырэктара, выкладчыкаў, яны і не здагадваліся, што афіцыйна іх інстытут даўно зачынены. Мужнасць і на гэты раз не здрадзіла іх дырэктару.

Адміністрацыйна-гандлёвы інстытут у Маладзечне даў за час сваёй дзейнасці добрыя, грунтоўныя веды студэнтам, даў нацыянальнае ўзгадаванне. Барыс Кіт, чалавек справы, адкрыў гэты інстытут, каб не пакінуць беларускіх дзяцей у такі цяжкі час, каб не пазбавіць іх інтэлектуальнага развіцця, каб захаваць у іх душах веру і высокую духоўнасць. У школе поўнасцю адсутнічала ўсялякая палітызацыя. Не было ніякіх ухваленняў Гітлера і яго арміі, ні адзін немец не пераступіў парога інстытута, і студэнты не ведалі, што іх дырэктар валодае нямецкай мовай. З другога боку — не дапускалася ніякіх выпадаў супраць савецкай улады, і кожны студэнт разумеў, што немцы будуць выгнаны з роднай зямлі. Навучанне ішло па праграмах, якія не зведалі ні польска-нямецкай, ні савецкай ідэалагічнай цэнзуры. Студэнты далучаліся да вытокаў гісторыі культуры Беларусі, яе звычаяў і традыцый. Настаўнікі былі руплівцамі на ніве нацыянальнай асветы, сапраўднымі інтэлігентамі і патрыётамі.

Глыбока вывучалася беларуская літаратура. Ні ў польскіх, ні ў савецкіх школах вучні нічога падобнага не чулі. Ім расказвалі пра Ефрасінню Полацкую, Кірылу Тураўскага, Францішка Скарыну, Сімяона Полацкага, Льва Сапегу, пра Вялікае Княства Літоўскае, пра Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Кастуся Каліноўскага, Янку Купалу і Якуба Коласа. Студэнты спявалі "Пагоню", "Люблю наш край", "Мы выйдзем шчыльнымі радамі", іншыя беларускія песні. Усё гэта садзейнічала нацыянальнай свядомасці і духоўнаму адраджэнню, а веданне матэматыкі, фізікі, гандлёвай справы, юрыдычных навук развівала інтэлектуальныя здольнасці маладых людзей.

Сёння мы можам чытаць сведчанні вучняў Барыса Кіта, іх цёплыя словы ўдзячнасці свайму дырэктару, якія яны выказалі праз 50 гадоў на сустрэчы ў Маладзечне ў ліпені 1992 года. "Барыс Кіт запомніўся вучням як неардынарны, высокаадукаваны чалавек, які актыўна падтрымліваў розныя ініцыятывы вучняў... Не раз настаўнік засцерагаў нас ад рызыкоўных, неабачлівых учынкаў. Не ўсведамлялі мы тады, як нялёгка было нашаму дырэктару: над ім навісала смяротная пагроза не толькі з боку акупантаў, але і ад "сваіх". У пасляваенны час савецкія ўлады жорстка расправуляліся з выкладчыкамі школ тыпу нашай. Магчыма, прадбачачы гэта, Барыс Кіт і вырашыў пакінуць Беларусь... Дзякуючы такім людзям, як Барыс Кіт, Іван Давідовіч, В.Магер, Г.Вяршынскі, у гэтай школе сфармаваўся і мой грамадзянскі светапогляд, які, нягледзячы на жыццёвыя цяжкасці, дапамог стаць свядомым беларускім мастаком. Варта спадзявацца, што з часам будзе створана праўдзівая і аб"ектыўная гісторыя трагічнага лёсу беларускай адукацыі ў паднявольныя часы. Павінна быць дадзена і належная ацэнка дзейнасці тых людзей, якія самаахвярна служылі справе выхавання беларускай моладзі. І безумоўна, што ў гэтай слаўнай плеядзе спадзвіжнікаў на ніве нацыянальнага адраджэння імя Барыса Уладзіміравіча Кіта зойме пачэснае месца!" (Кастусь Харашэвіч, мастак. "Звязда", 21 ліпеня 1992 года).



Б. КІТ у прафесарскай тозе.

ЭМІГРАЦЫЯ І НАВУКОВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У ЗША (1948—1972)

У 1944 годзе Барыс Кіт з сям'ёй выехаў на Захад. Цяжка было пакідаць Радзіму, дзе столькі распачата добрых спраў, столькі аддадзена сіл для беларускага школьніцтва, дзе заставаліся родныя, блізкія людзі, вучні — частка ягонай душы. У дзень ад"езду настаўніка на чыгуначную станцыю з"явілася вялікая грамада яго выхаванцаў, каб выказаць падзяку, павагу чалавеку,які запаліў для іх святло ведаў, даў накірунак у нялёгкую жыццёвую дарогу, і, хто ведае, можа развітацца назаўсёды. І хто тады мог думаць, што сустрэча адбудзецца толькі праз 50 гадоў, калі многіх з іх сапраўды ўжо не будзе ў жывых.

Працяг.
Пачатак у №№ 22—25.



Б. КІТ сярод заснавальнікаў Беларускага музея ў Лаймэне.

САЮЗ БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ: ПАСТАВІМСЯ СПАКОЙНА І РАЗВАЖЛІВА —

Міхаіл НІКІЦІН: ”ПЕРАД СУДОМ ГІСТОРЫІ”

22 ЧЭРВЕНЯ 1943 года, у 11 гадзін дня, на сцэну Мінскага гарадскога тэатра (сёння тэатр імя Янкі Купалы), упрыгожаную беларускімі і германскімі флагамі, выйшла і замерла па стойцы “смірна” шарэнга стройных юнакоў у шэра-зялёнай форме з бела-чырвона-белымі пагонамі і з такімі ж павязкамі на левым рукаве. З-за іх спін паказаўся і стаў ля трыбуны сам спадар Кубэ — генеральны камісар Беларусі. Так ён, ва ўласцівай яму манеры, эфектна і відочна вывеў на сцэну не толькі тэатра, але і гісторыі сваё новае дзецішча — Саюз беларускай моладзі.

Генеральны камісар павіншаваў сабраную ў зале моладзь з набыццём уласнай грамадскай і палітычнай арганізацыі, зачытаў свой загад, апублікаваны ў той жа дзень “Беларускай газэтай”. Загад быў кароткі. У ім гаварылася літаральна наступнае (тут мы захоўваем арфаграфію крыніцы):

“1. Дзеля аднастайнага ўзгадаваньня й арганізацыі беларускае моладзі засноўваецца Саюз Беларускае Моладзі.

2. Узгадаваньне беларускае моладзі, апрача бацькоўскага дому й школы з фізычнага, духовага й маральнага гледзішча перадаецца Саюзу Беларускае Моладзі.

3. Заданьне ўзгадаваньня беларускае моладзі ў Саюзе Беларускае Моладзі перадаецца Кіраўнічаму Штабу Беларускае Моладзі. Дзеля кіраваньня Кіраўнічым Штабам я вызначаю шэфа гэтага штабу, які рэпрэзэнтуе Саюз Беларускае Моладзі й мае сваю сядзібу ў Менску.

Шэф Кіраўнічага Штабу Беларускае Моладзі беспасярэдня падначальваецца мне.

Гэнэральны Камісар у Менску, сябра Райхстагу

Вільгэльм КУБЭ”.

Следам за генеральным камісарам выступіў новаспечаны шэф Кіраўнічага штаба Міхаіл Ганько. Яго намесніцай па рабоце з дзяўчатамі і дзяўчынкамі была прызначана ўрач Надзея Абрамава.

Пасля ўрачыстай цырымоніі ў тэатры група членаў толькі што абвешчанага Саюза беларускай моладзі (СБМ) накіравалася за горад, дзе па правы бок ад Смаленскай шашы знаходзіліся нямецкія гарнізонныя могілкі, і ўсклала кветкі на магілы забітых партызанамі ці памершых ад ран акупантаў.

У той жа “Беларускай газэце” за 22 чэрвеня 1943 года быў апублікаваны “Статут” новай арганізацыі. У ім гаварылася, што беларускі народ, скалечаны маральна за 300 год уладарання палякаў, маскалёў і асабліва “жыда-бальшавікоў”, мае патрэбу ў сур’ёзным аздараўленні, і пачаць гэтую ганаровую місію павінна моладзь з самой сябе. Вось што гаварылася ў “Статуце” аб мэтах арганізацыі:

“Мэтай “Саюзу Беларускае Моладзі” зьяўляецца ўзгадаваць маладых, ідэйных, мужных і паслядоўных будаўнікоў Новае Беларусі й падрыхтаваць іх да іхніх будучых заданьняў у народзе.

Таму СБМ мае служыць выкананьню наступных заданьняў: Вызваліць беларускую моладзь ад варожых і шкодных уплываў, адрадзіць яе маральна і ўзгадаваць у дусе новай Беларусі пад моцным правадырствам нацыянал-сацыялістычнае Нямеччыны.

Правесьці нацыянальна-патрыятычнае ўзгадаваньне праз азнаямленьне з мінуўшчынаю беларускага народу й краю, вывучэньне роднае беларускае мовы й культуры, развіцьцё нацыянальных асаблівасьцяў і пазнаньне свае Бацькаўшчыны.

Маральным узгадаваньнем выжыць у народзе нявольніцкую псыхіку, якая прынесла беларускаму народу такую цяжкую шкоду”.

У адпаведнасці з гэтымі палажэннямі “Статута” была распрацавана і тэматыка выхаваўчых гутарак, якія праводзілі з юнакамі і дзяўчатамі, з хлопчыкамі і дзяўчынкамі кіраўнікі. Спіс тэм захоўваецца ў ЦДАКР РБ, на жаль, пакуль яшчэ ў спецфондзе, сярод сакрэтных спраў. Вось некаторыя з назваў:

“Мы — Беларусы”, “Адольф Гітлер — наш вызваліцель”, “Жыды і бальшавікі — нашы сьмяротныя ворагі”, “Сяброўства і прыязнь”, “Трымай слова!”, “Быць беларусам — гонар”, “Пр[illegible] з нявольніцкай псыхікай”, [illegible]за — адзежа душы людзкай”, “Супрацоўніцтва з нацыянал-сацыялістычнаю Нямеччынаю прывядзе наш край да росквіту і добрабыту”, “Люблю наш край” і г.д.

Усякі, хто не асліплены крайнім [illegible]нацыянал-радыкалізмам, увогуле чужыя ідэалагічны[я] догмы і прыхільнасці, а проста любіць сваю Радзіму і ненавідзіць гітлераўскі фашызм, які прынёс ёй столькі гора, прачытаўшы гэтыя радкі з дакументаў, падумае пра ўсё гэта, напэўна, тое ж, што і я: іх складальнікі самым злачынным чынам сумясцілі несумяшчальнае — любоў да роднай зямлі і любоў да яе крывавых катаў. Дзецям і моладзі ўнушалі, што любіць Беларусь — гэта значыць любіць Гітлера і яго памагатых, і не толькі любіць,але і служыць ім самым адданым чынам. Менавіта служыць. Аб тых мэтах і задачах СБМ, якія не афішыраваліся, яшчэ ў лютым 1943 года сказаў на з’ездзе гебітскамісараў начальнік Аддзела Палітыкі Генеральнага Камісарыята Баўэр:

“Не перабіраючы ў метадах, мы павінны скарыстаць беларускую моладзь як рэзерв вайны... Гэта павінна быць зроблена з дапамогай асобай арганізацыі, якую фюрэр даруе беларускай моладзі... Цяпер паступае многа заявак з Германіі на маладую рабочую сілу. Толькі заводы самалётабудавання “Юнкерс” патрабуюць тры тысячы моладзі, і мы павінны яе даць, скарыстоўваючы для гэтага розныя сродкі”. На жаль, выказаны намер не застаўся на паперы. СБМ, заснаваны Кубэ і фінансуемы Генеральным Камісарыятам, жыў і дзейнічаў на беларускай зямлі цэлы год. Міхаіл Ганько, выступаючы ў Мінску 22 чэрвеня 1944 года, хваліўся, што на 1 чэрвеня гэтага года дружыны, грамады і звязы СБМ працавалі ў 14 акругах, 56 раёнах, а ўвесь “Саюз” налічваў у сваім складзе 12 635 чалавек моладзі абодвух полаў ва ўзросце ад 10 да 20 год, з якіх 3 500 знаходзіліся ўжо ў Германіі. Дзеці і юнакі, што апынуліся ў Германіі, уладкаваліся вучнямі на ваенныя заводы. Вось радкі з тыповага дагавора паміж кіраўніцтвам СБМ і авіяцыйным заводам Юнкерса:

“Інспектар Саюза беларускай моладзі перадае заводу Юнкерса па дагавору 1 000 юнакоў (мужчынскага полу) ва ўзросце 15—21 года для работы ў якасьці вучняў. Тэрмін іх работы неабмежаваны”.

Кіраўнікі СБМ Міхаіл Ганько і Надзея Абрамава разам з прэзідэнтам Беларускай Цэнтральнай Рады Радаславам Астроўскім пакрылі ганьбай свае галовы ў гісторыі з вярбоўкай вясной і летам 1944 года беларускіх юнакоў у так званыя “дружыннікі СС”, якая праводзілася ў рамках “Ваенна-дапаможнай службы еўрапейскай моладзі”. Адна з лістовак, выпушчаных Кіраўнічым штабам СБМ, гаварыла наконт гэтага: “Цябе заклікае эўрапейская моладзь да супрацы за новую Эўропу. Станься дружыньнікам СС і змагайся за вольную і новую Беларусь... Замэльдуйся зараз жа! Не чакай, хістаньне ёсьць здрадай твае Бацькаўшчыны!” Ахвярай гэтай правакацыі сталі многія сотні і нават тысячы беларускіх юнакоў. Іх апранулі ў форму нямецкай ваеннай авіяцыі і пасля кароткага навучання адпраўлялі эшалонамі ў Германію, дзе яны былі выкарыстаны ў якасці абслугоўваючага персанала на ваенных аэрадромах. Цэнтральная Рада наладжвала ім урачыстыя провады, у якіх удзельнічалі сам прэзідэнт і іншыя члены гэтага “ўрада”, а гэтак жа “правадыры” СБМ спадар Ганько і спадарыня Абрамава. У “дружыннікаў” на левых рукавах красаваліся бела-чырвона-белыя павязкі з эмблемай Саюза. Яны вельмі нагадвалі этыкеткі, наклееныя на тавар. Лёс гэтых юнакоў, адурманеных “патрыятычнай” эсбээмаўскай прапагандай, быў трагічны. Многія з іх загінулі: ваенныя аэрадромы падвяргаліся няшчадным бамбардзіроўкам, іншыя, вярнуўшыся на Беларусь, былі рэпрэсіраваны савецкімі ўладамі. Пацярпелі тады і многія іншыя былыя члены СБМ.

Нават аказаўшыся разам са сваім Кіраўнічым штабам у Германіі, пасля выгнання гітлераўскіх акупантаў з Беларусі функцыянеры СБМ працягвалі выслужвацца перад імі. Лічаныя месяцы заставаліся да краху гітлераўскага Рэйха, а гэтыя спадары ўсё яшчэ стараліся, прадаючы працу і атручваючы душы тысяч беларускіх хлопчыкаў і дзяўчынак, дзяўчат і юнакоў, адарваных ад бацькоў і вывезеных пры іх прамым удзеле ў Германію. У ЦДАКР Рэспублікі Беларусь захоўваюцца іх пісьмы і звароты-дакументы, якія ўражваюць выкрывальнай сілай. Вось што пісаў у верасні 1944 года спадар Барановіч — кіраўнік Рабочай групы СБМ у Германіі (на той момант увесь СБМ стаў такой “рабочай групай”): “Над галавой кожнага беларуса не партызана завіс меч помсты жыда-бальшавікоў. Што рабіць нам? На нас жа спадзяецца беларускі народ. Трэба змагацца. Дык сьмела у бой, дружыньнікі СС! Дык да самаахвярнай працы ў заводах і фабрыках, юнакі і юначкі!” У студзені 1945 года за спадаром Барановічам паўтарала спадарыня Абрамава, якая загадвала дзяўчынкамі: “Сяньня, дзеткі, вайна — жорсткая, страшная; рашальныя месяцы мы перажываем. Ад гэтых месяцаў залежыць **наша** перамога. Вы **павінны** як мага хутчэй, больш старанна як дагэтуль, больш упэўнена працаваць. Вынікі вашай працы — **зброя**, праз якую мы можам трапіць на бацькаўшчыну вольнымі яе гаспадарамі, а не бальшавіцкімі нявольнікамі”.

Вось так: працуйце лепш, дзеткі, і хутка разам з пераўцамі вернецеся на Беларусь. Як быццам мала было Беларусі адной гітлераўскай акупацыі. Спадарыня Абрамава лічыла, што мала. Перамога Гітлера была б яе перамогай. Працытаваныя дакументы ўсё яшчэ скрыты ад вачэй народа ў архіве, а трэба было б надрукаваць іх на ўсіх перакрыжаваннях [illegible]шыннымі літарамі. Беларусь павінна ведаць сваіх герояў! Якім антысаветызмам і якой “барацьбой” супраць сталіншчыны можна апраўдаць заклікі да дзяцей старанна працаваць на заводах, дзе выраблялася зброя смерці для іх братоў, бацькоў, мацярок, проста для землякоў, што змагаліся на фронце супраць фашызму ці жылі ў гарадах, якія з ліпеня 1944 года бамбілі “Юнкерсы”! Што гэта было, калі не злачынства супраць свайго народа? У гэтыя самыя месяцы, калі Абрамава суцяшала дзетак, Міхаіл Ганько і іншыя функцыянеры СБМ, апрануўшы на сябе нямецкую ваенную форму, шнырылі па працоўных лагерах, вярбуючы беларускіх юнакоў у штурмавую брыгаду СС “Беларусь”. Ён і на радзіме не сядзеў склаўшы рукі. 20 лютага 1944 года, выступаючы перад сваімі “саратнікамі” і гітлераўскімі саноўнікамі ў Мінску, ён з гонарам заяўляў: “Дабраахвотніцкія роты СС, служба ў ваенна-дапаможных аддзелах Нямеччыны, удзел у “Самаахове” — вось тое канкрэтнае, што ўнёс СБМ у агульнаэўрапейскую Вайну”.

Але няўжо зусім нельга сказаць нічога добрага пра Саюз беларускай моладзі, няўжо ўсё было дрэнна? Зусім не. Пажоўклыя старонкі акупацыйных газет і архіўныя дакументы захавалі нямала сведчанняў на карысць радавых членаў СБМ і яго функцыянераў. Нічога дрэннага не было ў тым, што дзецям і моладзі расказвалі пра гісторыю роднага краю, няхай нават скажоную ва ўгоду кан’юнктуры, вучылі роднай мове і літаратуры, развучвалі з імі беларускія песні. Члены СБМ дапамагалі падтрымліваць чысціню і парадак на вуліцах сваіх гарадоў і вёсак, былі завадатарамі культурных мерапрыемстваў, актыўна ўдзельнічалі ў правядзенні народных святаў, разам з Беларускай Народнай Самапомаччу праводзілі дабрачынныя акцыі. Зімой 1944 года санітарныя дружыны СБМ вялі барацьбу з эпідэміяй сыпнога тыфу. Дзяўчаты працавалі санітаркамі ў бальніцах, выхавальніцамі ў дзіцячых дамах і сіроцкіх прытулках, а пазней — у дзіцячых працоўных лагерах у Германіі. Многія з іх зімой 1944—1945 гадоў, праяўляючы самаадданасць, імкнуліся аблягчыць цяжкае жыццё дзяцей і падлеткаў, вывезеных з Беларусі, гэтых малалетніх нявольнікаў, якія працавалі на ваенных заводах Германіі і харчаваліся супам-вадзіцай і мізэрнымі порцыямі эрзац-хлеба. Іх любілі дзеці, і сама спадарыня Абрамава з удзячнасцю адгукалася аб тых выхавальніцах, якія, абдзяляючы сябе, на свае грошы куплялі дзецям калядныя падарункі. Георгію Барановічу давялося напісаць Ганько аб тым, што СД арыштавала і кінула ў канцлагер выхаваццеля Канвегу, які спрабаваў дабіцца паляпшэння харчавання для беларускіх юнакоў, хто працаваў на ваенным заводзе ў Дэсау.

Так, былі добрыя людзі і добрыя справы ў СБМ, але было іншае, галоўнае, на мой погляд. Тое, пра што ўжо сказана было ў гэтым артыкуле, і тое, пра што цяжка думаць без душэўнага болю. СБМ стаў адным са звенняў той жудаснай правакацыі, якую поруч з прамым тэрорам учыніла гітлераўскае кіраўніцтва і яго намеснікі супраць беларускага народа, уцягваючы яго ў арбіту калабарыцыянізму і тым самым наклікаючы на яго гнеў крамлёўскага “бацькі народаў”, распальваючы грамадзянскую вайну. Гэта была гэтаксама правакацыя супраць яго гісторыі і культуры, супраць яго нацыянальных сімвалаў — бела-чырвона-белага флага і герба “Пагоня”. Пры актыўнай дапамозе мясцовых калабарацыяністаў і іх арганізацый, сярод якіх быў і СБМ, у адзін рад аказаліся пастаўленымі паняцці: “Беларусь”, “гітлераўская Германія”, “незалежнасць”, “фашызм”, “адраджэнне”, “патрыятызм”, “нацызм”. У адным радзе са свастыкай аказаліся “Пагоня” і флаг, які сёння лунае над будынкам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Што гэта было, калі не злачынства?

У рэшце рэшт гістарычныя з’явы, якім быў і Саюз беларускай моладзі, што аб’яднаў толькі малую частку беларускіх дзяцей і моладзі (адных школьнікаў на 1943 год у Генеральнай акрузе “Беларутэніі” было зарэгістравана звыш 468 тысяч), судзяць не аўтары газетных артыкулаў і не ідэолагі розных палітычных напрамкаў, нават не гісторыкі. Іх судзіць сама гісторыя, перад тварам якой мае значэнне толькі наяўны факт, а не чые-небудзь тайныя, хаця і самыя высакародныя памкненні.

Няхай яе прыгавор будзе справядлівым.

Міхаіл НІКІЦІН.

ПІШУЦЬ СЯБРЫ МІЖНАРОДНАЙ АСАЦЫЯЦЫІ БЕЛАРУСІСТАЎ

КАНФЕРЭНЦЫЯ Ў САНКТ-ПЕЦЯРБУРГУ

Санкт-пецярбургская суполка МАБ, якую ўзначальвае вядомы рускі гісторык А.Мыльнікаў, разам з мясцовым Беларускім грамадска-культурным таварыствам і Расійскай нацыянальнай бібліятэкай правяла навуковую канферэнцыю “Санкт-Пецярбург і беларуская культура”. На ёй ішла гаворка пра багатыя традыцыі беларускай дыяспары ў паўночнай рускай сталіцы, згадваліся імёны Кастуся Каліноўскага, Адама Гурыновіча, Цёткі, Янкі Купалы, Браніслава Эпімах-Шыпілы і іншых пісьменнікаў, вучоных, дзеячаў мастацтва, якія тут або вучыліся, або працавалі. Кандыдаты гістарычных навук Мікалай Нікалаеў і Віталь Скалабан гаварылі пра каштоўныя беларускія матэрыялы ў санкт-пецярбургскіх зборах.

Пасля кафедральных дакладаў разгарнулася дыскусія за “круглым сталом”.

ПАДАРУНАК З ЛОНДАНА

Вядомы мецэнат, сябра камітэта МАБ Анджэй Цеханавецкі перадаў бібліятэцы асацыяцыі ў Мінску рэдкія выданні. Сярод іх ёсць кнігі на беларускай, польскай, англійскай мовах.

Доктар А.Цеханавецкі, які нядаўна наведаў Мінск з нагоды ўручэння яму дыплома ганаровага доктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта, узначаліў як “нейтральны” вучоны белару-

ГЭТА ЎЖО ФАКТ МІНУЎШЧЫНЫ

Аляксей ЛІТВІН:

"А КАЛІ ПАСТАРАЕМСЯ ЗРАЗУМЕЦЬ?"

Гэтым летам спаўняецца 50 год, як быў створаны Саюз беларускай моладзі (СБМ). З такой нагоды, відаць, ёсць неабходнасць яшчэ раз успомніць аб трагічнай гісторыі ваеннага ліхалецця, праўдзівы паказ якой дазваляе больш глыбока ўбачыць як змрочныя, трагічныя, так і светлыя патрыятычныя яе старонкі. Аб СБМ у савецкай гістарыяграфіі напісана як быццам бы нямала. Але ж калі бліжэй знаёмішся з напісаным, дык ствараецца ўражанне, што сапраўднай інфармацыі аб СБМ вельмі і вельмі нестае, а тое, што ёсць, падаецца толькі ў адным колеры — чорным.

Між тым знаёмства з архіўнымі матэрыяламі і дакументамі аб дзейнасці СБМ паказвае, што не выпадкова гэтыя дакументы, як і дакументы аб дзейнасці т.зв. "белорусских буржуазных националистов" да сённяшняга часу знаходзяцца ў спецсховішчах.

У чым жа тут справа? Адназначна адказаць на гэтае пытанне цяжка.

Адной з галоўных прычын, на наш погляд, з'яўляецца тое, што для сталіншчыны такія паняцці, як нацыяналізм, нацыянальная свядомасць, былі як чырвоная хустка для быка. У свядомасці мільёнаў людзей быў створаны і замацаваны штучны вобраз "ворага народа", "ворага савецкай улады". Ворагаў было створана зашмат, але ж найбольшую небяспеку з іх уяўлялі так званыя "нацдэмы", "белорусские буржуазные националисты". І таму барацьба з імі вялася вельмі пільная. На працягу 30—40-х гадоў з асаблівай жорсткасцю вынішчалася ўсё, што было звязана з адраджэннем беларускай нацыянальнай свядомасці. Сотні, тысячы беларускіх пісьменнікаў, паэтаў, іншых прадстаўнікоў маладой беларускай інтэлігенцыі былі загублены ў ГУЛагах. Любыя парасткі нацыянальнай свядомасці выкарчоўваліся, як гаворыцца, на корані. Поле дзейнасці для яжоўска-берыеўскіх сатрапаў было неабсяжным. Зараз мы ведаем, што ўсе гэтыя масавыя рэпрэсіі былі неабгрунтаванымі, ведаем, што працэс рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій працягваецца... Сталіншчына адыходзіць ад нас, ці адмірае, цяжка і марудна. Але ж не трэба думаць, што гэта была вайна з "ветранымі мельніцамі". Таталітарная сістэма, сталіншчына, спахапілася, яна зразумела: калі не стрымаць, не зліквідаваць працэсы "беларусізацыі", "украінізацыі" ды іншых "зацый", то вельмі хутка можа здарыцца, што гэтыя працэсы перастануць быць кіруемымі. Гэта нешта накшталт таго, хто стварае бомбу ці ставіць міну. Дастаткова аднаго недакладнага руху і...

Вядома, што бомба "нацыянальнай свядомасці" была небяспечная ў 20—30-я гады як для Усходняй Беларусі і Украіны, так і для заходніх іх частак. Польскі ўрад у адпаведнасці з умовамі драпежніцкага Рыжскага міру праводзіў палітыку адкрытай паланізацыі Заходняй Беларусі, дзе пражывала больш 5 мільёнаў чалавек, што выклікала адкрыты супраціў з боку беларускага насельніцтва, асабліва нацыянальна свядомай яго часткі, дзеячаў нацыянальна-адраджэнскага руху.

Як гэта ні дзіўна, але і польскае кіраўніцтва, і сталіншчына ў сваёй барацьбе супраць беларускага нацыянальна-вызваленчага руху з'яўляліся хаўруснікамі.

Гандаль Беларуссю і беларусамі, пачаты ў Брэсце і прадоўжаны затым у Рызе, фактычна працягваўся ў 20—30-я гады. Ахвярамі быў беларускі народ і найперш нацыянальна свядомая яго частка.

Па-другое. Другая сусветная вайна, падзеі верасня 1939 года, уз'яднанне беларускага народа ў адзінай сям'і, як успышка маланкі, імгненна прасвяціла галовы тым, хто накіроўваў свой позірк на ўсход. Гульня бальшавікоў у дэмакратыю скончылася адразу пасля выбараў 1939 года. Пачалася масавая дэпартацыя ненадзейных для савецкай улады. Працэс гэты быў спынены раптоўным нападам Германіі на Савецкі Саюз.

Вялікая Айчынная вайна — самая балючая і да сённяшняга дня крывавая рана ў памяці амаль кожнай беларускай сям'і. Таму тут асабліва цяжка ўспрымаюцца адыходы ад звыклых стэрэатыпаў ацэнкі рэчаіснасці, якія былі навязаны афіцыйнай ідэалогіяй у той час, калі кожны найбольш балюча перажываў як асабістае гора, так і трагедыю народа.

Зараз, калі па-новаму прачытваем нашу гісторыю, мы павінны сапраўды паглядзець на яе як таго патрабуе дыялекты[illegible] метад — ва ўсіх яе ўзаемасу[illegible]. Гэта не так проста, таму [illegible] прыходзіцца адмаўляцца ад традыцыйнага, спрошчанага ўяўлення: свой — вораг. Свой — гэта той, хто на баку савецкай улады, вораг — хто на баку Германіі. Апошнім часам, праўда[illegible] беларускім друку сталі з'я[illegible]ца артыкулы са спробай з [illegible]ых бакоў паглядзець на падзеі таго часу. Большасці з нас, абцяжараных спрошчаным ідэалагічным выхаваннем, вельмі цяжка зразумець, тым больш пагадзіцца, што сярод тых, хто падчас вайны супрацоўнічаў з немцамі, маглі быць нацыянальна свядомыя людзі, патрыёты сваёй Радзімы, якія дзейнічалі на карысць беларускай дзяржаўнасці, сваёй Бацькаўшчыны, абуджэння нацыянальнай свядомасці народа. Зразумела, што калі ўзнікла такое балючае пытанне, якое датычыць лёсаў тысяч людзей, дык яно не можа не закрануць тых эмоцый і ацэнак, якія маюць месца ў сучасным грамадстве.

Трагічнае крыло вайны кранула амаль кожнага беларуса. Над нашым народам тады, як ніколі раней у гісторыі, навісла страшэнная небяспека — увогуле знікнуць з твару зямлі. Становішча складвалася такім чынам, што калі б вызваленне прадоўжылася да чэрвеня 1945 года, то вызваляць, магчыма, ужо не было б каго. І гэтаму аб'ектыўна спрыяла як дзейнасць акупантаў, якія актыўна праводзілі ў жыццё свае чалавеканенавісніцкія планы, так і дзейнасць Масквы, якая ў асобе пастаноў і дырэктыў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б заклікала падняць увесь беларускі народ на "смяротную барацьбу з захопнікамі". Пасярэдзіне быццам бы заставаўся сам беларускі народ, які вайною зноў быў разарваны на часткі. У Генеральным камісарыяце Беларусі, што складаў чвэртку даваеннай тэрыторыі, гітлераўцамі праводзілася фактычна палітыка "беларусізацыі", арыентаваная ў накірунку Германіі. Астатнія вобласці і раёны БССР былі ўключаны ў рэйхскамісарыят Украіна, генеральны камісарыят Літва, акругу "Беласток". Усходняя частка Беларусі з'яўлялася тылам групы армій "Цэнтр".

Палітыка акупантаў у гэтых частках некалькі адрознівалася ад той, якая праводзілася ў Генеральнай акрузе Беларусь.

У Генеральнай акрузе Беларусь (уваходзілі Баранавіцкі, Барысаўскі, Вілейскі, Глыбоцкі, Ганцавіцкі, Лідскі, Навагрудскі, Слонімскі, Мінскі і Слуцкі абласныя (акруговыя) камісарыяты) генеральны камісар Вільгельм Кубэ праводзіў палітыку "заігрывання", якая садзейнічала таму, што частка беларускіх нацыянальных дзеячаў, нацыянальна-свядомай інтэлігенцыі актыўна ўключылася ў працу на баку акупантаў. Частка гэтая была нешматлікая. І таму, разумеючы сваю слабасць, яна асноўную ўвагу засяродзіла на правядзенні нацыянальна-асветніцкай дзейнасці, прапагандзе нацыянальнай культуры. Гэтай справай займалася ў асноўным грамадская арганізацыя "Беларуская народная самапомач" (БНС), якая прэтэндавала на палітычную сілу і дамагалася ад гітлераўцаў дазволу на стварэнне сваіх прадстаўнічых органаў беларускага самакіравання, беларускай паліцыі, войска і г.д. Аднак немцы, зыходзячы са сваіх планаў, не хацелі пра такое і слухаць. І гэта выклікала незадаволенасць з боку калабарантаў, якія разумелі, што іх аўтарытэт у масах можа быць толькі пры наяўнасці акрэсленай палітычнай лініі. Такой палітычнай лініяй магла быць толькі нацыянальная ідэя — патрабаванне стварыць незалежную беларускую дзяржаву з усімі атрыбутамі дзяржаўнасці.

Ці маглі гітлераўцы даць дазвол на ажыццяўленне такой ідэі? Вядома, не. Яны добра разумелі, што любая нацыянальная ідэя нясе магутны патэнцыяльны зарад, скіраваны сваім вастрыём на дасягненне незалежнасці, стварэнне сваёй дзяржаўнасці. Сталін і Гітлер добра разумелі гэта і вельмі асцярожна бралі яе на ўзбраенне.

У самыя крытычныя моманты Сталін вымушаны быў вельмі асцярожна звярнуцца да нацыянальна-патрыятычных пачуццяў рускага народа.

У пэўных рамках звяртаўся да гэтай зброі Гітлер, які да апошняга часу баяўся даць палітычную перспектыву Уласаву.

Аднак у пасляваеннай савецкай гістарыяграфіі палітыка акупантаў у адносінах да нацыянальнага пытання падавалася вельмі спрошчана ці ўвогуле фальсіфікавалася. Нам падаецца, што дзейнасць СБМ, як і ўвогуле дзейнасць беларускай калабарацыі, неабходна разглядаць у трохі іншай сістэме каардынат, бачыць яе праз прызму вывучэння беларускага нацыянальна-адраджэнскага руху, які, слава Богу, наперакор сталіншчыне, наперакор дзеянням польскіх улад у Заходняй Беларусі ўсё ж не згінуў.

Беларуская нацыянальная ідэя, нягледзячы ні на што, яшчэ цеплілася, яшчэ была жывая. Яе носьбітамі былі беларускія нацыянальныя дзеячы, якія ўцалелі ад рэпрэсій, насельніцтва Заходняй Беларусі. Толькі наяўнасць пэўнага ўрадлівага грунту магла даць і дала ў вельмі неспрыяльных варунках ваеннага часу ўсплеск нацыянальнай свядомасці, якая выявілася ў дзейнасці СБМ, БНС, існаванні Беларускай Краёвай Абароны.

Таму нам уяўляецца: было б карысным удумліва паглядзець на тыя спробы "заігрывання" з нацыянальнымі пачуццямі народаў, якія адбываліся ў час мінулай вайны.

З гэтага боку выклікае цікавасць стварэнне і дзейнасць Саюза беларускай моладзі, фактычна адзінай дазволенай немцамі грамадскай арганізацыі, якая атрымала магчымасць весці шырокую выхаваўчую дзейнасць у нацыянальным беларускім духу.

Ствараючы СБМ, немцы, вядома, ставі[illegible]е мэты, разглядаючы яго [illegible]вой будучы рэзерв, як рэзервуар працоўнай сілы для Нямеччыны. Але яны разумелі і іншае: каб арганізацыя запрацавала, каб яна была жывая, ёй неабходна было даць акрэсленую ідэю, што [illegible]ло і закладзена ў яе статуце.

Статут [illegible]М сцвярджаў, што мэтай арганізацыі ёсць выхаванне "паслядоўных будаўнікоў новай Беларусі і падрыхтоўка іх да выканання будучых народных задач".

Вядучым напрамкам выхаваўчай работы сярод моладзі павінна было быць "вызваленне беларускай моладзі ад варожых і шкодных уплываў, яе маральнае адраджэнне і выхаванне ў духу Новай Беларусі пад кіраўніцтвам народна-сацыялістычнай Германіі".

Асабліва настойліва падкрэслівалася неабходнасць патрыятычнага выхавання моладзі, пазбаўлення яе ад гістарычна абумоўленай рабскай псіхалогіі, выхавання нацыянальна-грамадскай свядомасці, павагі да працы, дысцыпліны і г.д. Усё гэта было скіравана на тое, каб моладзь "адчула сваю адказнасць за лёс і дабрабыт сваёй Радзімы і заўсёды змагла бы працаваць і служыць для свайго народа і краіны".

Стварэнне СБМ суправаджалася шырокай прапагандысцкай кампаніяй, накіраванай на тое, каб паказаць змену адносін Германіі да беларусаў і супрацьстаяць савецкай прапагандзе аб каланізацыі Беларусі. Упершыню на ўрачыстасцях пры абвяшчэнні СБМ В. Кубэ сказаў аб **самавызначэнні** беларускага народа ў звязку з А. Гітлерам.

Ствараючы СБМ, немцы спадзяваліся шляхам розных абмежаванняў, пільнага нагляду цвёрда трымаць яго ў сваіх руках. Аднак наперакор усяму гэтая арганізацыя зрабіла дзеля развіцця беларускага нацыянальнага руху вельмі шмат. Нацыянальна-патрыятычнае выхаванне юнакоў і дзяўчат, відаць, усё ж прынесла свае плады, стварыла традыцыю шырокага руху моладзі, разумення таго, што Бацькаўшчына зможа адрадзіцца, будучы толькі незалежнай. Гітлераўцы добра разумелі, што арганізацыя СБМ і асабліва лозунгі — "адраджэнне беларускай нацыі, беларускай культуры, беларускага нацыянальнага духу", — пад якімі яна стваралася, выклічуць адназначна рэзка варожае стаўленне да СБМ з боку савецкага партызанскага руху. Што на самай справе і здарылася.

Як бачна з дакументаў апошняга, якраз лозунгі і іх ідэалагічная аснова больш за ўсё і хвалявалі савецкае падполле. Падпольныя партыйныя і камсамольскія органы Беларусі вельмі аператыўна і якасна адрэагавалі на стварэнне СБМ. Важную ролю ў распрапагандаванні і дыскрэдытацыі СБМ адыграла пісьмо ЦК ЛКСМБ "Аб рабоце камсамола Беларусі па выкрыццю і разлажэнню гітлераўскай маладзёжнай арганізацыі "Саюз беларускай моладзі".

Стварылася парадаксальная сітуацыя. Ва ўмовах слабай нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, арганізаванага жорсткага супраціўлення акупантам палітыка беларусізацыі аб'ектыўна спрыяла ўмацаванню саветызацыі. Таму барацьба з гітлераўцамі злілася з барацьбой супраць беларускага адраджэння і беларускай культуры.

Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 годзе прывяло і да "вызвалення" на доўгі час і ад ідэі беларускай дзяржаўнасці. Вызваленне не прынесла міру і кансалідацыі беларускай нацыі. Сталінская прапаганда рабіла ўсё, каб узмацніць нацыянальны раскол, канчаткова выбіць са свядомасці людзей "яд нацыяналістычнай" прапаганды. Гэта трэба было для таго, каб "осоветизировать" Заходнюю Беларусь, якая шмат гадоў пасля вайны вяла ўзброенае супраціўленне сталінізацыі.

Як вядома, у гісторыі ёсць такая адметная асаблівасць: у ёй, як у жывёльным ці ўвогуле матэрыяльным свеце, усё ўзаемазвязана. І нельга якую-небудзь з'яву ці падзею ў жыцці вялікай групы людзей, народа штучна затаіць ці свядома выкрасліць. Гэта абавязкова праз пэўны час павінна праявіцца. "Белая пляма" вакол СБМ існуе толькі таму, што гэта было выгадна сталінізацыі. На жаль, гэты "афіцыйны" пункт гледжання, які быў уведзены ў савецкую гістарыяграфію ў канцы 40-х гадоў з падачы Л. Цанавы, існуе і зараз.

Будзем спадзявацца, што з кожным днём гэтых "плям" будзе ўсё менш. А дзеля гэтага хацелася б атрымаць лісты ад людзей, хто ў свой час браў удзел у арганізацыях СБМ. Хацелася б даведацца, пачуць шчырыя словы аб тым, як ён бачыў гэтую арганізацыю, яе мэты і задачы тады, у 1943—1945 гадах, і як ён ставіцца да яе сёння. Будзем вельмі ўдзячныя за пісьмы.

Аляксей ЛІТВІН,
загадчык аддзела ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі АН РБ, кандыдат гістарычных навук.

ска-польскую камісію па вяртанню культурных каштоўнасцяў і правёў яе першае пасяджэнне.

ПЕРШЫЯ КАРЭЛІЦКІЯ

З актыўным удзелам сяброў Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў прайшлі ў Карэлічах першыя раённыя краязнаўчыя чытанні. Кандыдат філалагічных навук Лідзія Савік гаварыла пра вядомага прадстаўніка беларускага замежжа прафесара Барыса Кіта, чыё дзяцінства прайшло ля Карэліч (на пасяджэнні прысутнічала сястра вучонага, дэманстраваліся яго здымкі). Прафесар Адам Мальдзіс расказаў пра славутага падарожніка, нацыянальнага героя Чылі Ігната Дамейку, кандыдат філалагічных навук Уладзімір Мархель — пра паэта XIX стагоддзя Вінцэся Каратынскага, гісторык Міхась Чарняўскі — пра помнікі археалогіі ў верхнім Панямонні, кандыдат архітэктуры Тамара Габрусь — пра касцёл у Міры. З зямляцкім словам на канферэнцыі выступіў пісьменнік Янка Брыль, а з аповядам пра яго творчасць — Маргарыта Яўхімава. Літаратурным мясцінам раёна быў прысвечаны даклад гісторыка Лідзіі Кулажанка, карэліцкім габеленам — мастацтвазнаўцы Маі Яніцкай. Успамінамі пра паэта Алеся Мілюця падзяліўся яго брат Іван.

У фае Дома культуры, дзе праходзіла канферэнцыя, была наладжана выстава вырабаў народных майстроў, экспанатаў будучага карэліцкага краязнаўчага музея. Чытанні вырашана праводзіць штогод.

НОВАЯ СУПОЛКА

У Інстытуце славяназнаўства і балканістыкі АН Расіі (Масква) утварылася новая суполка МАБ. Узначаліў яе доктар філалагічных навук Юры Лабынцаў. У суполку ўвайшлі літаратуразнаўцы, мовазнаўцы, гісторыкі.

А. БЕЛАВУСАВА,
рэферэнт МАБ.

АДКРЫТЫ ЛІСТ СПАДАРУ ЛІЦВІНКУ

МІФЫ І РЭАЛЬНАСЦЬ

Паважаны калега Васіль Дзмітрыевіч!

Прачытаў Вашае інтэрв'ю "Ад зямлі, ад чорнай скібы" ў "Голасе Радзімы" (20 мая 1993 г.), дзе Вы абяцалі цікавую канферэнцыю "Фальклор як сродак выхавання нацыянальнай свядомасці", падрыхтаваную ажно трыма міністэрствамі (культуры, адукацыі, інфармацыі) і Асацыяцыяй фалькларыстаў Беларусі. У гутарцы з Дзіянай Чаркасавай, прызнаюся, ёсць і Вашая самарэклама: спакваля акцэнт пераносіцца на Прэзідэнта гэтай Асацыяцыі Ліцвінку як, бадай што, вырательніка фальклору. Так, прынамсі, вынікае з кампазіцыі і агульнай танальнасці інтэрв'ю: "Пачалася наша размова, — гаворыцца ў ім, — на даволі сумнай ноце. Васіль Дзмітрыевіч зазначыў, што ... распадаецца Акадэмія навук. Фактычна ўжо знішчаны Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, дзе "засталося два з паловай кандыдата навук". Пад "рознымі соусамі і рознымі мечамі", па словах Ліцвінкі, ідзе знішчэнне і фальклорнай лабараторыі, дзе ён працуе.

Сапраўды, амаль апакаліпсіс паводле Ліцвінкі. Адносна фальклорнай лабараторыі, дзе Вы, здаецца, працавалі загадчыкам, а пазней навуковым супрацоўнікам, тут будзе дарэчы дыпламатычная фігура ўмаўчання. Але ж Вашая ацэнка акадэмічнага інстытута, дзе ёсць таленавітыя супрацоўнікі, якія самі маглі б узначальваць інстытуты, мякка кажучы, некарэктная. Ды і Акадэмія навук (тут я маю дакладную інфармацыю, бо працаваў у ёй *каля 27 гадоў*) стаіць яшчэ моцна, хоць там ідзе пэўная рэарганізацыя (павольная і баязлівая, як на маю думку).

Пачалі Вы, як кажуць, "за упокой", а закончылі "за здравие", калі перайшлі да сваёй прэзідэнцкай дзейнасці: "У асацыяцыі нам удалося аб'яднаць усіх... Дык вось, адраджаць будзем нацыянальную культуру... Мы працуем там, дзе фальклор жыве паўнакроўным жыццём..." На здароўе, скажам і мы, працуйце, толькі не выдавайце сябе за першаадкрывальнікаў там, дзе да Вас шмат папрацавалі фалькларысты-этнамузыказнаўцы, паслядоўнікі таго ж Р.Шырмы, пра фалькларыстычную дзейнасць якога Вы пісалі кандыдацкую дысертацыю. І наогул, беручы ідэі ў сваіх папярэднікаў, не варта маляваць іх шэрымі і чорнымі фарбамі. Вашая канцэпцыя фальклору ад "паганства" і ад "чорнай скібы" спрэчная, але я — не пра гэта. Маю на ўвазе Вашую заяву пра свой удзел у нейкім "Міжнародным кангрэсе беларусістаў у Маладзечне, тэмай якога была нацыянальная самасвядомасць". Але якраз пра яе, самасвядомасць, кажаце Вы, "я там нічога і не чуў".

І не дзіва, скажу я, бо, здаецца, Вы пабывалі там "адным бокам, адным скокам", як дасціпна гаворыцца ў адной беларускай чарадзейнай казцы. Пачнём з таго, што Вы перабыталі падзеі: 19—20 жніўня 1992 года ў Маладзечне адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя "Фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў", падрыхтаваная па ініцыятыве Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф.Скарыны пры актыўным удзеле Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў (яе ўстаноўчы кангрэс адбыўся ажно 2[illegible] [illegible]7 мая 1991 года ў Мінску), [illegible]эрства адукацыі Рэспублікі Б[illegible]арусь, урэшце, Маладзечанскага гарвыканкома, кіраўнікі якога паспрыялі, каб гэты прадстаўнічы навукова-асветніцкі форум адбыўся на міжнародным узр[illegible]ні.

В.Ліцвінку я па[illegible] там на секцыі "Шляхамі ад[illegible]джэння" пры абмеркаванні даклада Зінаіды Мажэйкі "Праблема выжывання аўтэнтычнага фальклору беларусаў", праілюстраванага фрагментамі навукова-дакументальных фільмаў дакладчыцы. Вы заявілі там свой даклад "Фальклор як сродак выхавання нацыянальнай самасвядомасці". Ён, дарэчы, і стаў тэмаю рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі 3—4 мая 1993 года, якую Вы, Васіль Дзмітрыевіч, чамусьці супрацьпаставілі папярэдняй, маладзечанскай.

Наша маладзечанская канферэнцыя была дэмакратычнай: у ёй мелі права ўдзельнічаць і тыя, хто не рыхтаваў даклада, — ад прафесара да студэнта. Вы, відаць, былі сярод вольных слухачоў, бо тэксту Вашага даклада я не знайшоў сярод матэрыялаў канферэнцыі, калі мы іх рыхтавалі да друку. Але ў такім выпадку я не разумею, чаму Вы не пачулі выступленняў Васіля Быкава, Ніла Гілевіча, Адама Мальдзіса, міністра культуры Яўгена Вайтовіча, дакладаў "Архетыпы беларускага менталітэту", "Спроба вызначэння структуры і эвалюцыі нацыянальнай самасвядомасці", "Рэлігія і нацыянальная самасвядомасць беларусаў", "Заходнерусізм як праблема беларускай свядомасці", "Роля канфесійнага фактару ў нацыянальнай свядомасці беларусаў", "Усходне-хрысціянскі (праваслаўны) фактар у нацыянальнай самасвядомасці беларусаў", "Традыцыйная этнічная свядомасць беларусаў" і многіх іншых, у якіх менавіта абмяркоўваліся субстанцыянальныя і функцыянальныя аспекты пастаўленай на канферэнцыі праблемы.

Чытаючы карэктуру яе матэрыялаў, я напаткаў каля шасцідзесяці дакладаў і выступленняў, дзе тэма нацыянальнай свядомасці заяўлена тэматычна. Іншыя ж дакладчыкі гаварылі пра родную мову, культуру, рэлігію, фальклор, гісторыю народа, дзе яго самасвядомасць аб'ектывавалася, сталася рэальнасцю духоўнага жыцця. Дарэчы, у назвах дакладаў Вашай, Васіль Дзмітрыевіч, канферэнцыі "Фальклор як сродак выхавання **нацыянальнай свядомасці**" апошніх двух ключавых слоў наогул няма. Але мы не сумняваемся, што аўтэнтычны фальклор быў і застаецца адной з чыстых крыніц самасвядомасці народа. Гэта датычыцца і беларускага дваранства: пра яго вёў гаворку Ян Запруднік, якога Вы таксама неадэкватна зразумелі. Бо вядома, што пачынальнікамі беларускай літаратуры былі выхадцы з беларускай шляхты; яна нават па сваіму побыту была пераважна вясковай, сялянскай. Я ўжо не кажу пра гісторыю жывапісу, архітэктуры, музыкі: яны ствараліся пераважна беларускім дваранствам, сялянствам, рамеснікамі. Як вядома, адзін з глыбокіх культуролагаў О.Шпэнглер залічваў "памеснае" (фальваркавае) дваранства да вяскова-сялянскага класа як носьбіта арганічнай, экзістэнцыянальнай культуры ў адрозненне ад пазнейшай гарадской цывілізацыі, па сваёй сутнасці другаснай і функцыянальнай.

Кніга "Беларусіка-2", якая друкуецца па матэрыялах маладзечанскай канферэнцыі, неўзабаве выйдзе ў свет, і чытач сам пераканаецца, хто мае рацыю ў нашай з Вамі, паважаны калега, спрэчцы. Я, здаецца, удзельнічаў у сотні канферэнцый рознага ўзроўню, але гэта — першая, калі даклады і выступленні ахвотна друкавалі газеты і часопісы, а ўсе [illegible]атэрыялы выдаюцца грунтоўнай кні[illegible], а не ратапрынтнымі, др[illegible] падрыхтаванымі копіямі, як звычайна бывае ў такіх выпадках.

Прычына Вашага, калега Ліцвінка, нігілізму ў тым, што Вы, здаецца, занадта сур'ёзна, без "драбкоў солі" ўспрынялі сво[illegible]тытул Прэзідэнта. Чаму[illegible] ў час амаль усеагульнай галечы, пасля павальнага абрабавання праз механізмы інфляцыі амаль усе былыя нашыя інстытуты сталі акадэміямі і універсітэтамі, а тэхнікумы і вучылішчы — каледжамі, усе былыя дырэктары і старшыні, у тым ліку шматлікіх працэдурных ці міфічных грамадскіх арганізацый — Прэзідэнтамі. Калі б сабраць сёння ўсіх прэзідэнтаў аднаго Мінска, то, здаецца, атрымалася б некалькі батальёнаў. Адным словам, цэлы полк. Гэта — нашае банальнае славянскае перамальніцтва, на якое ў свой час звярнуў увагу Ф.Дастаеўскі ў сваіх "дзённіках". На жаль, пераймаюцца не еўрапейская дзелавітасць, працавітасць і дакладны прафесіяналізм, а вонкавыя "прэстэжныя" этыкеткі.

Вось і Вы, Васіль Дзмітрыевіч, паглядзелі на наш маладзечанскі муравейнік у полі зроку сваёй прэзідэнцкай аўры. Нешта падобнае адбылося з растыражыраванымі сродкамі масавай інфармацыі героямі міфа пра "чалавека года" альбо нават "стагоддзя". Некаторыя з маіх старых знаёмых дазволілі апублікаваць свае фатаграфіі пад гэтым тытулам.

Летась і мне прыслалі на подпіс карэктуру маёй кароткай біяграфіі для даведніка "Хто ёсць хто" Кембрыджскага біяграфічнага цэнтра. Прапанавалі нават прысланаць мне прыгожы дыплом на скуры, з партрэтам, які дакументальна засведчыў бы маю "неўміручасць". Каб атымаць гэты дакумент, трэба было прысланаць на расходы за дыплом і асабісты экземпляр "Біяграфіяў" нейкую суму фунтаў ці долараў, відаць, зусім нязначную для англійскіх дактароў навук ці прафесараў. Пераведшы яе на нашыя інфляцыйныя рублі, я напісаў сваім кембрыджскім калегам: "Калі б я свае апошнія дзесяць гадоў жыў толькі Святым Духам, то і тады маіх назапашаных, а пасля абясцэненых рублёў не хапіла б на палавіну Вашага ганаровага дыплома". А назаўтра забыў пра сваю "неўміручасць".

Дык аднясём справу неўміручасці да кампетэнцыі свайго народа і Усявышняга. Нават калі кожны навуковец хоча стаць Прэзідэнтам.

Уладзімір КОНАН.





"ЗВІНЯЦЬ ЦЫМБАЛЫ І ГАРМОНІК"

— так называўся рэспубліканскі фестываль народнай музыкі, які прайшоў у Паставах. У свята гэтага — глыбокія карані. Яно ідзе ад вядомага ў рэспубліцы Груздаўскага цымбальнага аркестра. Аб захаванні багатай спадчыны клапоцяцца і ў мясцовай дзіцячай музычнай школе, дзе адраджаецца цікавасць да ігры на цымбалах.

У Паставах увогуле цэняць народную мелодыю і цёпла прымаюць гасцей. Гэта і прыцягвае сюды фальклорныя калектывы з усіх абласцей Беларусі.

У свяце вызначыліся майстэрствам ансамблі народнай музыкі "Радуніца" з Мазыра, "Паазер'е" з Пастаў, ансамбль "Чачэрскі гармонік" з Гомельшчыны, "Капыльскія дудары" з Міншчыны, госці з горада Падольска Маскоўскай вобласці.

Два дні не змаўкалі на вуліцах Пастаў і ў гарадскім парку, на адкрытых канцэртных пляцоўках у калгасах і саўгасах раёна музыка і песні, дэманструючы багацце народных талентаў зямлі беларускай.

НА ЗДЫМКАХ: выступае дзіцячы цымбальны аркестр Пастаўскай музычнай школы; гучаць народныя мелодыі.

Фота Я. КАЗЮЛІ.

ПАД КРЫЖАМ ЕФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Рэгламентам прадугледжаны на з'ездзе і даклад ад урада Рэспублікі Беларусь "Эканамічная сітуацыя і магчымасці выхаду з крызісу". Ад заходняй дыяспары з дакладам выступіць Янка Запруднік.

Аднак мерапрыемствы, звязаныя са знаходжаннем у Беларусі землякоў з-за мяжы, пачнуцца задоўга да адкрыцця з'езда. Гэта і ўрачыстасці ў Нясвіжы, прысвечаныя юбілейным датам у гісторыі горада; і свята ў Навагрудку, прысвечанае гадавіне каранацыі князя Міндоўга; Купалле на Стаўбцоўшчыне ў Коласавых мясцінах і Баркалабаўскае купалле ў Быхаўскім раёне.

7 ліпеня адкрыецца Нарачанскі форум у летніку "Зубраня" на возеры Нарач. У ім прымуць удзел 160 дзяцей 12—15 гадоў з блізкага і далёкага замежжа, а таксама нашых беларускіх хлопчыкаў і дзяўчынак. Для іх падрыхтавана спецыяльная праграма "Пад знакам Грунвальда", якая мае на мэце пазнаёміць гасцей і гаспадароў з малавядомымі старонкамі нацыянальнай беларускай гісторыі. З'ездзяць дзеці ў старажытны беларускі горад Полацк, пазнаёмяцца з цудоўнай прыродай прыгожага нарачанскага краю.

У дні работы з'езда і прадз'ездаўскія дні адбудзецца мноства іншых значных культурных падзей. У Дзяржаўным мастацкім музеі адкрыецца выстава мастакоў Пашкевічаў са Злучаных Штатаў Амерыкі, а ў Палацы мастацтва — выстава "Жыве Беларусь!". У Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Ф.Скарыны падрыхтавана выстава "Беларусы ў свеце", а ў далейшым мяркуецца выдаць даведнік з такой жа назвай. На будынку, дзе раней знаходзіўся Інбелкульт, адкрыецца мемарыяльная дошка ў гонар Максіма Гарэцкага.

Работа па падрыхтоўцы такога важнага і незвычайнага мерапрыемства, як з'езд беларусаў свету, праведзена каласальная. Упершыню збяруцца разам людзі адной нацыянальнасці, але не заўсёды аднолькавых перакананняў, розных жыццёвых шляхоў, аднак верыцца, што аб'яднаных адным жаданнем — прынесці карысць Бацькаўшчыне, дапамагчы ў цяжкую хвіліну.

Дзіяна ЧАРКАСАВА.

Паважаныя беларусы замежжа!

Звяртаюцца да Вас супрацоўнікі Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, які знаходзіцца ў Траецкім прадмесці Менска па адрасу: вул. М. Багдановіча, 15. Музей наш малады, ён існуе з 1986 года. Пакуль што ў ім наведвальнікаў прыцягвае выстава "Покліч", якая распавядае пра літаратурнае жыццё на Беларусі ў 20—30 гады, пра творчы ўзлёт пісьменнікаў і іх трагічны лёс.

Жыццё сцвярджае, што літаратура і гісторыя заўсёды крочаць побач. Таму не выпадкова экспанаты музея расказваюць і пра гістарычныя падзеі: І сусветную вайну, Лютаўскую рэвалюцыю, Кастрычніцкі пераварот, утварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі і БССР. Асобныя раздзелы і залы прысвечаны літаратурным аб'яднанням "Маладняк", "Узвышша", "Полымя", развіццю драматургіі, крытыкі, літаратуры Заходняй Беларусі. Многія матэрыялы, якія мы сёння можам бачыць і чуць у нашым музеі, былі альбо наогул забаронены, альбо ім надаваўся лжывы сэнс.

Цяжка пералічыць усе імёны і прозвішчы надзвычай таленавітых паэтаў, пісьменнікаў, дзеячаў культуры, якія былі рэпрэсіраваны ў 20—30 гады.

Гэта М. Гарэцкі, Ц. Гартны, А. Дудар, М. Чарот, У. Хадыка, У. Дубоўка, М. Зарэцкі... Усяго больш за 200 чалавек. У 37-м годзе іх заставалася толькі 40 (з улікам нацыянальных секцый). Беларускамоўных — толькі 18. КДБ канфіскавала звыш 40 раманаў, якія ўзбагацілі б нашу літаратуру. Сталінскія рэпрэсіі нанеслі нашай культуры велізарныя страты, якія мы будзем адчуваць увесь час.

Пакуль што гэта толькі першыя крокі нашага музея. Асноўная экспазіцыя, якая яшчэ ствараецца, будзе апавядаць пра развіццё беларускай літаратуры з часоў Полацкага княства і да XX стагоддзя. Зрабіць гэта нялёгка. Вякамі з Беларусі вывозілі матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці, рабавалі і знішчалі непаўторныя помнікі культуры. Сёння ў нас амаль не засталося старадрукаў, бо яны вывезены ў музеі Санкт-Пецярбурга і Масквы, Кіева і Львова, Вільні і Варшавы. Але мы думаем пра нашых нашчадкаў і верым, што зробім усё магчымае дзеля адраджэння Бацькаўшчыны.

Дарагія беларусы замежжа! Будзем вельмі рады, калі ў час З'езду беларусаў свету, на які, спадзяёмся, прыедуць многія з Вас, завітаеце ў наш музей. Прымем да ўвагі Вашы прапановы, меркаванні, будзем удзячны і за матэрыялы, якія Вы можаце нам прадставіць. Гэтае сціплае запрашэнне хочацца скончыць радкамі незабыўнага Купалы, у якіх раскрыта вялікае значэнне для народа яго мінуўшчыны, бо народ, які забыў мінулае і не ведае яго, не варты будучыні, ён перастае быць народам:

"Пачнем збіраць зярно к зярняці,
Былое ў думках уваскрашаць,
Каб быт на новы лад пачаці
І сеўбу новую пачаць".

Жыве Беларусь!

З павагай і прывітаннем-запрашэннем супрацоўнікі Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

САЛДАТЫ ПЕРАМОГІ



Хор ветэранаў вайны і працы ельскага Дома культуры, што на Гомельшчыне, добра ведаюць у многіх вёсках. У рэпертуары калектыву — беларускія народныя мелодыі, песні грамадзянскага гучання. Але пераважаюць, вядома, творы ваенных гадоў. І выконваюць іх ветэраны з асаблівым натхненнем: гэта ж іх маладосць.

НА ЗДЫМКУ: хор ветэранаў.

Фота М. СЯРГЕЕВА.

СПАДЧЫНА

АД ПЕРШАЙ БАРАЗНЫ ДА АПОШНЯГА СНАПА

Рабоце ў полі папярэднічалі агледзіны нівы, або провідкі. Селянін ішоў у поле, узяўшы з сабой загорнутыя ў чысты абрус (ці ручнік) пірог, соль, асвячоныя галінкі вярбы, а калі провідкі прыходзіліся на велікодны тыдзень, то і чырвоныя яйкі. Звычайна на Юр'е ён аглядаў пасевы азімых. Паклаўшы на мяжы абрус з хлебам-соллю, гаспадар абыходзіў палеткі і ўтыкаў галінкі вярбы па краі поля, нібы аберагаючы яго ад непажаданых стыхій, напасцяў і сімвалічна благаслаўляючы веснавое адраджэнне нівы. Пасля рытуальнай трапезы рэшткі ад ежы і шкарлупінне ад яек закопваліся на мяжы, а зверху часам яшчэ накладваліся камяні. У заходнім Палессі (в. Талмачова Столінскага р-на) у дзень заворвання выпякалі хлябцы ў форме крыжоў, пасля трапезы адзін з іх пакідалі на ўзмежку, прысыпаючы зямлёй, што сімвалізавала адзінства нівы і хлеба, узгодненасць прыроды і спраў чалавека.

У тым жа ідэйным рэчышчы былі вытрыманы і абрадавыя нормы, звязаныя з сяўбой. Сяўба з'яўлялася, бадай што, важнейшай змястоўнай часткай народнага календара, вакол якой склаўся цэлы комплекс традыцыйных аграрных ведаў, феналагічных назіранняў, прыкмет, трапных прымавак, прыказак, абрадавых дзействаў, вераванняў, што займалі ў сістэме нацыянальнай культуры істотнае месца. Яе адкрыццё (засеўкі) нярэдка злівалася з вясновым ворывам у адзіным працоўным і абрадавым цыкле і прыходзілася, гледзячы па абставінах, на другую палавіну красавіка — пачатак мая. "Зазвінеў жаўрук — не выпускай сахі з рук". "Зязюлька вымавіць "ку-ку", тады і сей на ўсю руку"... Народныя прыкметы і рэкамендацыі аптымальных тэрмінаў сяўбы амаль дакладна супадаюць з вынікамі сучаснай агранамічнай навукі. Нават на поўначы Беларусі сяўбу пачыналі звычайна да Юр'ева дня. Пры спрыяльных умовах стараліся штосьці пасеяць напярэдадні Вялікадня ў Чысты чацвер ці пятніцу: згодна павер'ю, пасевы ў першым выпадку вырастуць чыстымі, без пустазелля, а ў другім — збажына не будзе баяцца ні дажджу, ні граду. У заходнім Палессі сяўбу яравых пры добрым надвор'і імкнуліся здзейсніць да Вялікадня. Прычым у тыдзень перад святам пазбягалі сеяць агарод і поле; гэты тыдзень у народзе называлі сухавеем, і высеянае збожжа нібыта горш прыжываецца ў глебе. Аднак больш надзейнымі арыенцірамі ў сістэме аграрных адлікаў лічыліся нерухомыя (стацыянарныя) каляндарныя святы, у прыватнасці, вясновыя Юр'е (6 мая) і Мікола (22 мая). Да Міколы ў асноўным завяршалі сяўбу яравых на Палессі. У ліку першых высявалі авёс і пшаніцу, з агародных — капусту, агуркі, потым — ячмень, гарох, проса, каноплі, пазней іншых — лён і грэчку. Згодна апрабіраванай сістэме народных прыкмет і феналагічных назіранняў рэкамендавалася сеяць авёс, калі з'явяцца камары, пшаніцу — у перыяд цвіцення чаромхі, ячмень — у час росквіту каліны. Найбольш спрыяльнымі для сяўбы ў народзе лічыліся цёплыя, ціхія і пахмурныя дні; пры ветраным воблачным надвор'і перавага аддавалася ўсходняму і заходняму вятрыскам; збожжа, высеянае пры ўстойлівых паўночных ці паўднёвых вятрах, па шматгадовых прыкметах, больш марудна ўзыходзіла ў халоднай і малавільготнай глебе. Звярталі ўвагу і на фазы месяца, найлепшай лічылася поўня: "поўны месяц — поўныя свірны збожжа". Збажына, пасеяная на маладзік, нібыта была больш схільная кусціцца і даваць тонкую салому. Пры іншых аднолькавых умовах улічвалі і тыднёвы каляндар, аддаючы перавагу аўторку, субоце, крыху меней — серадзе і пятніцы.

Вясновыя аграрна-каляндарныя святы завяршаліся Сёмухай (Духа, Тройца) і Ерамеевым днём (13 чэрвеня; "прыйшоў Ерамей — больш не сей"). Сяўбу азімых пачыналі пасля Спаса (19 жніўня) і заканчвалі да Пакрова (14 кастрычніка). Пры гэтым пазбягалі сеяць у так званы "чарвівы тыдзень" (28 жніўня — 4 верасня). Найбольш значныя сімволіка-абрадавыя функцыі для сейбітаў на гэтым этапе выконвалі старажытныя святы Прачыстай (28 жніўня) і Багача (2-я Прачыстая, 21 верасня; "прыйшоў Багач — кідай рагач, бяры сявеньку, сей памаленьку").

У дзень сяўбы ў сялянскай хаце падтрымліваліся ўзорны парадак і чысціня. Хата і ніва ва ўяўленні селяніна ўспрымаліся як двуадзіная іпастась, па аналогіі і пасевы на ніве павінны быць чыстымі, без пустазелля. Той жа сакральнай ідэі быў падпарадкаваны і рытуальны звычай старанна мыцца перад сяўбой і апранаць чыстае адзенне. У Падняпроўі адкрываць сяўбу даручалі самым бездакорным і нявінным хлапчукам 10—14 год, якіх апраналі ў святочнае адзенне. Засеўкі праводзіліся адборным насеннем, якое змешвалася з зернем, выбраным з зажыннага снапа (зжатага мінулым летам з нагоды зажынак) ці вянка, звітага пасля заканчэння жніва (дажынак). У Панямонні частку семяннога збожжа асвячалі ў царкве; яго ссыпалі ў асобую торбу, завязвалі каляровым шнурком і пакідалі для засевак.

Пасля засявання некалькіх загонаў селяніна чакаў святочны стол, да якога запрашалі памочнікаў, сваякоў, суседзяў. Лічылася: чым больш шчодры і разнастайны пачастунак з нагоды засевак, тым багацейшы будзе ўраджай. У гэты дзень пазбягалі даваць адзін другому агню ці пазычаць што-небудзь па суседству (паводле павер'я, разам з пазычанымі рэчамі да суседа магла перайсці і частка ўраджаю). У паўночнай Беларусі сейбіт часам працаваў у полі з сякеркай за поясам, "каб хлеб урадзіўся такім, што яго прыйшлося б ссякаць сякерай" (заўважым, з сякеркай ён і араў поле, каб падпраўляць сваю саху, рабіць дробны рамонт на доўгіх гонях). У заходнім Палессі вядомы прымхі, што лён вырасце высокім, калі яго пасее самы высокі чалавек у вёсцы. Ва ўсходнім Палессі існавала павер'е, што лён будзе доўгім і валакністым, калі яго пасее дзяўчына з расплеценымі косамі. Падобныя павер'і, што неслі ў сабе водгулле язычніцкай міфалогіі і асацыятыўна-вобразнага мыслення, вызначаліся на тэрыторыі Беларусі багатай разнастайнасцю і выступалі ў большай ступені як сюжэтная аснова абраду, які набліжаўся да прасякнутага патаемным сэнсам тэатралізаванага відовішча.

Увасобіўшы ў сабе міфалагічныя сюжэты, народныя веды і абшчынныя нормы маралі, аграрныя звычаі і абрады адыгрывалі істотную ролю ў жыццядзейнасці народа-этнаса, у фарміраванні беларускага менталітэту, аб'ядноўваючы людзей на базе агульных каштоўнасцей і інтарэсаў. Будучы неад'емнай часткай беларускай традыцыйнай культуры, яны выконвалі важныя функцыі ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці, у працоўным і маральным выхаванні маладога пакалення, перадачы яму жыццёвага вопыту і добрых традыцый сваіх продкаў.

Наступны ідэйна-абрадавы комплекс земляробчых звычаяў і абрадавых дзеянняў прыходзіўся на перыяд уборкі ўраджаю і заканчэння палявых работ. Кожная сельскагаспадарчая культура мела свае прыдатныя тэрміны ўборкі, якія пазначаліся ў народным календары, стасуючыся з асенняй сяўбой, ворывам зябліва, апрацоўкай сельскагаспадарчых прадуктаў і інш. Амаль кожнае свята гэтай пары, пачынаючы са Спаса, несла ў сабе пэўны ідэйна-абрадавы змест, звязаны з плёнам рытмічна арганізаванай працы, з ушанаваннем шчодрых дароў восені, што надавала чалавечаму існаванню новы эмацыянальны імпульс, стварала новы настрой з надзеяй на бестурботную зіму і бязбеднае жыццё. Важная сімволіка-абрадавая роля надавалася першаму і апошняму зжатым снапам — так званаму "гаспадару" і жытняй бабе, якія адзначалі сабой святы зажынак і дажынак і вакол якіх быў сканцэнтраваны цэлы комплекс працоўных, грамадскіх і сямейных звычаяў, абрадаў, тэатралізаваных відовішчаў з адпаведнымі песнямі, гульнямі, рытуальнымі дзействамі, святочнымі ўборамі і абрадавай ежай. На Палессі зажынкі адкрывала сталая, умудроная вопытам і аўтарытэтная на сяле жанчына. Жнеі перавязвалі кісці правай рукі жгутом саломкі, што, згодна старажытнаму павер'ю, служыла абярэгам ад стомы і хваробы, надавала працаздольным жаночым рукам новыя сілы. Зжатае жыта звязвалі з дапамогай цурак (яны нярэдка ўпрыгожваліся арнаментальнымі ўзорамі), ставілі ў бабкі, якія налічвалі 10 снапоў кожная; высушаныя ў бабках ці на азяродах снапы складалі ў копы па 60 снапоў кожная, адзін вялікі сноп накладвалі зверху — і дажджавыя кроплі лёгка слізгалі ўніз, не закранаючы самога збожжа.

Першы зажынны сноп цырымонна неслі ў дом, ставілі на кут, з яго, як упаміналася, потым выбіралі збожжа і змешвалі з семянным зернем. Па заканчэнні жатвы на межах пакідалі некранутымі некалькі сцяблоў з каласамі, якія звязвалі ў пучок — "завівалі бараду". Адначасова рабілі дажыначны вянок, які надзявалі на галаву самай прыгожай жанчыне. Апошні сноп зжатага жыта ўпрыгожвалі кветкамі, убіралі ў спадніцу, завязвалі паверх каласоў хусту і пад звонкія гукі дажынных песень урачыста неслі з поля дадому, захоўваючы яго па традыцыі на будучы ўраджай. З нагоды дажынак выпякалі вялікі каравай. У некаторых месцах дажынкі спраўлялі двойчы — па заканчэнні жніва азімых і жніва яравых. Дажынкі неслі ў сабе асвечаны старажытнай традыцыяй багаты духоўны змест, звязаны з культам зямлі і ўрадлівасці, адначасова ўслаўлялі жанчыну і яе нялёгкую працу.

Яшчэ адзін цыкл аграрных абрадаў прыходзіўся на глыбокую восень пасля заканчэння сяўбы азімых і ўборкі бульбы. З гэтай нагоды на Палессі білі пеўня, "каб усё было добра, каб усё спявала" (водгулле язычніцкіх ахвярапрынашэнняў). Гэтае свята спраўлялі вечарам, накрываючы шчодры стол; аднак сярод шматлікіх святочных страў не было гарэлкі: па словах мясцовых жыхароў (Столінскі р-н), "яе патрэбу тады не панімалі". На гэту пару прыпадаў і старажытны абрад "Жаніцьба коміна". Глыбокай восенню, пасля бабінага лета, калі дні станавіліся кароткімі, сяляне ўпершыню вечарам, "гледзячы на зіму", урачыста запальвалі вогнішча-светач, які ўяўляў сабой на Палессі конусападобную ўнізе трубу-комін, пад якой гарэлі смалістыя корчыкі, асвятляючы хату. Жанчыны і дзяўчаты вадзілі вакол коміна карагоды з песнямі і тэатральнымі гульнямі, інтэрмедыямі, шчодра абсыпаючы комін семем і збожжам. Не падлягае сумненню глыбокі выток гэтага святочнага абрада, звязанага з культам агню і хлеба.

Увасобіўшы ў сабе старажытныя светаўяўленні, абшчынныя нормы маралі, народныя веды і калектыўны вытворчы вопыт, земляробчыя звычаі і абрады адыгрывалі істотную ролю ў жыццядзейнасці народа-этнаса, аб'ядноўваючы людзей на базе агульных каштоўнасцей і інтарэсаў. Будучы неад'емнай часткай беларускай традыцыйнай культуры, яны выконвалі важныя функцыі фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, працоўнага і маральнага выхавання маладога пакалення, перадачы яму жыццёвага вопыту і добрых традыцый сваіх продкаў.

Віктар ЦІТОЎ.

Заканчэнне.
Пачатак у № 25.

СТАРОНКА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

крынічка

СТАРОНКА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Уладзімір АРЛОЎ

СІМЯОН ПОЛАЦКІ

Няма на Беларусі іншага горада, які даў бы Радзіме столькі знакамітых людзей, як старажытны Полацк. Тут, над задуменнай Дзвіною, каля белакаменнага Сафійскага сабора, у купецкай сям'і, нарадзіўся ў далёкім 1629 годзе хлопчык, якому таксама наканавана было стаць славутым і праславіць родны горад.

Але гэта, вядома, здарылася не адразу. Хлопчык хадзіў у школу ў Полацку, потым паехаў па навуку далёка ад дому: спачатку ў Кіеў, а адтуль у Вільню, у акадэмію. Здольны і працавіты палачанін вывучаў там лацінскую і грэчаскую мовы, граматыку і логіку, матэматыку і астраномію, музыку і паэтыку — навуку пра тое, як пісаць вершы...

Вільня была тады сталіцаю Вялікага Княства Літоўскага, багатай і магутнай беларускалітоўскай дзяржавы, якая за сто гадоў да гэтага аб'ядналася з Польскім каралеўствам. Маскоўскія цары часта нападалі на беларускія землі. У 1654 годзе зноў пачалася вайна. Вільню захапілі царскія войскі, і полацкаму студэнту давялося вярнуцца дадому.

У родным горадзе ён пайшоў у Богаяўленскі манастыр. Апранаючы манаскае адзенне, кожны чалавек атрымлівае новае імя. Так Самуіл Гаўрылавіч Пятроўскі-Сітняковіч стаў братам Сімяонам.

Пры манастыры была школка, дзе малады манах пачаў працаваць настаўнікам. Полацкія хлапчукі любілі яго за цікавыя ўрокі, на якіх ён часта чытаў свае вершы.

Неўзабаве Полацк заняло рускае войска на чале з самім царом Аляксеем Міхайлавічам. Вучоны манах Сімяон выступіў перад ім з чытаннем уласных вершаў. Тады ён яшчэ не ведаў, што праз восем гадоў пераселіцца ў Маскву і будзе выхоўваць царскіх дзяцей.

Ішоў час. На Бацькаўшчыне па-ранейшаму лілася кроў, гінулі людзі, зарасталі лесам палі. Страшная вайна, у якой загіне палова жыхароў тагачаснай Беларусі, здавалася бясконцаю. І тады Сімяон вырашыў перасяліцца ў Маскву. Ён пакідаў бацькоўскую зямлю не таму, што любіў цара і верыў яму. Ён ведаў, што маскоўскія цары заўсёды былі ворагамі нашага народа. Але вучоны хацеў спакою, каб займацца навукаю і пісаць кнігі.

У Маскве Сімяон напісаў больш за дзесяць кніг. Ён быў асветнікам, гэта значыць заўсёды імкнуўся дзяліцца з людзьмі сваімі вялікімі ведамі. Дзеля гэтага адкрыў у царскім палацы друкарню. Першаю надрукаванаю там кнігаю стаў складзены ім самім “Буквар”. Вучоны палачанін заснаваў першую ў Маскве вышэйшую навучальную ўстанову — Эліна-грэчаскую акадэмію, якую потым пачалі называць Славяна-грэка-лацінскай. Цар Аляксей Міхайлавіч даверыў Сімяону выхаванне сваіх дзяцей. Сярод іх быў і будучы цар Пётр Першы.

Сімяон, якога ў Маскве пачалі называць Полацкім, перакладаў кнігі з польскай і лацінскай моў, пісаў п'есы для спектакляў створанага з яго дапамогаю першага ў Маскве прыдворнага тэатра. Але ўлюбёным яго захапленнем, як і раней, была паэзія. Свае вершы ён пісаў на беларускай, польскай, лацінскай і рускай мовах. Гэта былі самыя розныя творы: вершаваныя апавяданні, віншаванні да святаў, байкі, загадкі... Тагачасныя вершы не заўсёды падобныя на тыя, што вы чытаеце сёння ў сваіх кніжках. У вершы, якім сустракаў Сімяон цара Аляксея ў Полацку, адна толькі назва складаецца з 79 слоў.

Чытаць творы Сімяона Полацкага не заўсёды лёгка, але надзвычай цікава. З іх можна даведацца пра восем цудаў свету і пра тое, што прадказваюць чалавеку планеты, пра нашу выдатную асветніцу Ефрасінню і пра біблейнага асілка Самсона, які забіў аслінаю косткаю тысячу ворагаў... Некаторыя сучасныя паэты пішуць вершы ў выглядзе кругоў, квадратаў і іншых геаметрычных фігур. Напэўна, яны лічаць сябе першаадкрывальнікамі, але такія вершы-жарты за трыста гадоў да іх ужо складаў наш славуты зямляк.

Жывучы далёка ад Бацькаўшчыны, Сімяон Полацкі ніколі не забываў яе. Ён часта ўспамінаў Беларусь, жадаў ёй у вершах міру і шчаслівага, заможнага жыцця. Частку сваёй вялікай бібліятэкі асветнік загадаў адаслаць пасля ягонай смерці ў полацкі Богаяўленскі манастыр. Захаваў ён у Маскве і сваю уніяцкую веру.

Беларусы будуць заўсёды памятаць Сімяона [illegible]цкага і ганарыцца ім. У выдавецтве “Мас[illegible]ая літаратура” выйшла вялікая кніга паэзіі нашага выдатнага суайчынніка. А хутка ў Полацку, побач з будынкамі Богаяўленскага манастыра, дзе манах Сімяон вучыў дзяцей, падымецца помнік гэтаму слаўнаму сыну зямлі беларускай.



“К[illegible] — дзявочая краса”. Для брэстаўчанкі Наташы БРЫШТЭН (на[illegible]аку) гэта не проста прымаўка. У конкурсе з такой назвай Наташа стала пераможцай. Яе каса ўсім на зайздрасць.

Цяпер Наташа заканчвае вучылішча. Наперадзе яе чакае прафесія медыцынскай сястры.

Фота Э. КАБЯКА.

Юрась СВІРКА

ВЕЦЕР

Рук не мае, ног не мае,
А высока узлятае.

Ён імклівы, ён крылаты,
Пругкі ён і зухаваты.

Мяккі-мяккі — гладзіць
шчокі,
Цёплы-цёплы — трэцца
збоку.

І калючым ён бывае,
Нават дужых з ног збівае.

Наганяе людзям страху:
Ён з дамоў зрывае дахі.

Правады ірве, як ніткі, —
І знікае ўвачавідкі.

Гне кусты і ломіць дрэвы,
Разганяе дождж-залеву.

У свой час ён, неўгамонны,
Ветракі круціў нястомна.

У мінулым ды і зараз
Лёгка ў моры гоніць парус.

Сілы, хуткасці хапае,
Хоць ні рук, ні ног не мае.

Мяккі, рэзкі і знішчальны —
Вось які непастаянны!

СУП З СЯКЕРЫ

НАРОДНАЯ КАЗКА

Ішоў салдат дарогаю. Падбіўся, прагаладаўся. А ў торбе — ні крошкі. Адна старая сякера без тапарышча, якую ён па дарозе знайшоў.

Зайшоў салдат у сяло. Пытаецца ў сустрэчнага мужыка:

— Хто тут у вас на харчы багацейшы?

Падумаў мужык і кажа:

— Ды вунь у трэцяй хаце адна баба жыве. Багацця ў яе хоць адбаўляй, а скупая, не дай Бог.

Зайшоў салдат да скупой бабы, добры дзень даў. Разгаварыўся і папрасіў есці.

— А мой ты служывенькі, а мой ты саколік. Няма ж у мяне нічога — ні ў гумне, ні ў клеці. Сама галодная сяджу...

Дастаў салдат сякеру з торбы і кажа:

— Ну, нічога, старая, давай чыгун, будзем суп з сякеры варыць.

Здзівілася баба, але чыгун дала.

Укінуў салдат сякеру ў чыгун, наліў вады і паставіў у печ.

Паварыў трохі свой суп, пакаштаваў і кажа бабе:

— Нішто суп, не хапае толькі солі ды круп.

Пакаштавала і баба салдацкага супу.

— Але, — кажа, — праўда: не хапае солі і круп.

— То, можа, падкінеш трохі? — пытаецца салдат.

Памулялася баба, але ўсё ж прынесла солі і круп.

Паварыў салдат яшчэ свой суп, пакаштаваў.

— Нішто, — кажа, — суп, не хапае толькі цыбулі ды здору або лою. Можа, падкінеш, бабка?

Падкінула баба ў салдатаў суп цыбулі ды здору.

І тут такі пах пайшоў, што салдат аж зачхаў на ўсю хату. Ды і ў бабы слінкі пацяклі.

Наеўся салдат супу з сякеры, бабу пачаставаў.

— Ай, служывенькі, — дзівіцца баба. — Век пражыла, а такой стравы не ела: гэта ж і суп смачны, і сякера цэлая!

Уладзімір ПАЎЛАЎ

КУКАРЭКА

Певень, певень,
Кукарэка,
З дзедам б'ецца
Недарэка.
Толькі дзед
Курэй карміць —
Стрымгалоў
К яму курыць.
І такі ўжо
Ён сярдзіты —
Вочы дык крывёй
Наліты.
Прыўзляціць —
І б'е нагамі,
Бы зласлівец
Батагамі.
Ну гарачка,
Ну артыст,
Ну курыны
Каратыст!
Бараніць курэй —
То добра.
Біся з коршакам
Харобра.
А навошта дзеду
Куры,
Што з яго
Спускаеш скуру!
Ёсць у дзеда
Абаронца,
Гаспадарыць
Пры заслонцы.
Гэта — баба.
Мой мілок,
Трапіш загадзя
Ў гаршчок.

СКОРАГАВОРКІ

Місісіпі-Місурачка,
Ці ты певень,
Ці курачка!
Я не певень,
Не курачка —
Місісіпі-Місурачка.

Дзве сяброўкі нашы Полі
Хутка поле прапалолі.

Крычаў Архіп, Архіп ахрып.
Не трэба Архіпу крычаць да
хрыпу.

СМЯШЫНКА

— Паўлік, чаму ты кожны дзень спазняешся ў школу! Няўжо ў вас будзільніка няма!

— Будзільнік ёсць. Ды толькі ён звоніць, калі я сплю.

Рэдактар Вацлаў МАЦКЕВІЧ

ЗАСНАВАЛЬНІК:

Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом (таварыства “Радзіма”.



НАШ АДРАС:

220600, МІНСК, ПРАСПЕКТ Ф. СКАРЫНЫ, 44.

ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Пазіцыя рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, не заўсёды супадаюць.

Газета набрана і звярстана ў камп'ютэрным цэнтры рэдакцыі газеты “Вечерний Минск”. Аддрукавана ў друкарні “Беларускі Дом друку”.
Тыраж 5 000 экз.
Індэкс 63854. Зак. 939.
Падпісана да друку 28. 06.1993 г.